Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 САКАВІКА 2017 г. СЕРАДА № 49 (28413)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

З УПЭЎНЕНАСЦЮ ГЛЯДЗЕЦЬ У БУДУЧЫНЮ

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Днём Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Дзеючы Асноўны Закон вызначыў прынцыпы суверэнітэту краіны, стаў ядром усёй прававой сістэмы і трывалым фундаментам для пабудовы сацыяльнай дзяржавы.

Захаванне норм, закладзеных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца гарантам стабільнасці і дабрабыту ў грамадстве, забеспячэння дастойных умоў жыцця грамадзянам.

Сёння мы можам з упэўненасцю глядзець у будучыню, разумеючы, што наша зладжаная работа, з'яднанасць і стваральная энергія прадвызначаюць далейшае развіццё і паступальны рух Айчыны да працвітання.

Жадаю ўсім здароўя, дабра, шчасця і міру.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Максім РЫЖАНКОЎ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Канкрэтна пастаўлены задачы як ураду, так і мясцовым органам улады па аказанні садзейнічання ўсім грамадзянам у працаўладкаванні і вырашэнні любых іншых пытанняў, якія тычацца жыццезабеспячэння. Такім чынам будзе ўмацоўвацца ўзаемадавер'е паміж уладай і грамадствам. Толькі ў такой кансалідацыі намаганняў — наша сіла».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 8°
Віцебск	+ 7°
Гомель	+ 4°
Гродна	+ 7°
Магілёў	+ 5°
Мінск	+ 5°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.03.2017 г.

Долар ЗША	1,9143	▲
Еўра	2,0371	▼
Рас. руб.	0,0324	▲
Укр. грыўня	0,0711	▲

ISSN 1990 - 763X

НОВАЯ «ВОПРАТКА» СВІСЛАЧЫ

Фота БЕЛТА.

Рэканструкцыя набярэжнай Свіслачы ў Мінску вядзецца ад пешаходнага моста каля вострава Мужнасці і Смутку да вуліцы М. Багдановіча. Кошт работ у бягучых цэнах перавышае 4,1 млн рублёў. Здаць аб'ект у эксплуатацыю плануецца сёлета ў першым паўгоддзі. (Аб тым, якія яшчэ новыя аб'екты з'явяцца ў сталіцы, — на старонках сённяшняга выпуску «Мясцовага самакіравання».)

■ Абітурыент-2017

ЭВАЛЮЦЫЯ ЦТ

Чаму для конкурснага адбору лепш падыходзіць рэйтынгавая сістэма?

У якой форме павінны праходзіць уступныя іспыты ў ВНУ? Ці можа тэст аб'ектыўна ацаніць, наколькі прэтэндэнт на студэнцкі білет добра арыентуецца ў дакладных або гуманітарных навуках? Адказы на гэтыя пытанні шукаюць не толькі ў нашай краіне. Напрыклад, у Расіі пасля прыходу на пост міністра адукацыі Вольгі Васільевай праціўнікі Адзінага дзяржаўнага экзамену чакалі, што яго, нарэшце, адменяць. Але радыкальных перамен пакуль не адбылося... Ёсць і іншае меркаванне: калі АДЭ рэзка адмяніць, гэта рашэнне моцна ўдарыць па ўсіх, таму што школа — не хуткасны аўтамабіль, у якім руль можна круціць туды-сюды.

Пра тое, што сістэма цэнтралізаванага тэсціравання павінна змяняцца, часта кажуць і ў нас. Перыядычна ў розных аўдыторыях узнімаецца пытанне пра неабходнасць увядзення профільнай часткі ўступнага экзамену — так званай часткі С, якая ёсць у расійскіх тэстах. Хапае ў нас таксама ініцыятараў сумяшчэння выпускных іспытаў у школе і ўступных у ВНУ, якія ківаюць у бок расійскага Адзінага дзяржаўнага экзамену... Ці будуць калі-небудзь беларускія абітурыенты пісаць на ЦТ эсэ, мы вырашылі пацікавіцца ў дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалая ФЯСЬКОВА.

Тэставы бал — не школьная адзнака

— Цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта добра адпрацаваная тэхналогія, якая з году ў год якасна вырашае сваю задачу: ранжыруе абітурыентаў для іх наступнага залічэння ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і мае шэраг неаспрэчных пераваг перад іншымі формамі правядзення экзамену. Дзякуючы цэнтралізаванаму тэсціраванню, усе пастаўлены ў роўныя ўмовы. Уступныя выпрабаванні пазбаўлены нервознасці, уплыву чалавечага фактару, выключаны любыя карупцыйныя праявы. Да таго ж цэнтралізаванае тэсціраванне з'яўляецца малазатратнай і найбольш тэхналагічнай формай правядзення ўступных іспытаў.

СТАР. 4

НЕ СТОЙ ПАД СТРАЛОЙ

Без вежавых, маставых, казловых кранаў цяпер немагчыма уявіць ніводныя буйныя пагрузачныя і будаўнічыя работы. Ды вось толькі на тэхніку бяспекі пры гэтым зважаюць не заўжды. «Кранападу», на шчасце, у Беларусі няма. Але няшчасныя выпадкі і надзвычайныя здарэнні падчас працы гэтых механізмаў усё ж здараюцца.

Што становіцца іх прычынай? І як папярэдзіць ігнараванне інструкцый? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з начальнікам упраўлення нагляду за бяспекай пад'ёмных збудаванняў і атракцыёнаў Дзяржпрамнагляда Пятром КЛІМКО.

Зачапіўся круком за провад з токам

Няшчасны выпадак адбыўся летась. На чыгуначнай станцыі «Клімавічы» аўтакран грузіў цэглу. Машыніст аўтакрана рухаўся на іншае месца яго ўстаноўкі, не апусціўшы стралу. Ён вырашыў сэканоміць некалькі хвілін на прасцейшую маніпуляцыю. Пры гэтым інструкцыя рэгламентуе, што перасоўвацца аўтакран мусіць толькі з апушчанай стралой. Машыніст патрабаванне праігнараваў, і... крукі стропаў стралы зачапіліся за паветраную лінію электраперадачы. Кіроўца тут жа атрымаў паражэнне токам.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ПРЭЗІДЭНТ РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ НАЗНАЧЫЎ:

КАСЦЕВІЧ Ірыну Анатольеўну — міністрам працы і сацыяльнай абароны;

КАРПЯКА Уладзіміра Валянцінавіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па г. Мінску;

СТРАЧКО Андрэя Сяргеевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Кыргызскай Рэспубліцы;

ЕСІНА Руслана Алегавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Японіі.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

БУЗОЎСКАГА Ігара Іванавіча — кіраўніком адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска;

ДЗЯМІДАВА Аляксандра Уладзіміравіча — генеральным дырэктарам ААТ «Нафтан»;

ПАЎЛАВА Віталя Пятровіча — генеральным дырэктарам ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод»;

ПАЧЫНКА Алега Міхайлавіча — генеральным дырэктарам ААТ «Гомельтранснафта Дружба»;

ГУНЬКО Сяргея Марцінавіча — намеснікам міністра прамысловасці;

КУРАША Віктара Іосіфавіча — дырэктарам Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі.

* * *

Усе, каго ўчора Прэзідэнт назначыў на высокія дзяржаўныя пасады — людзі энергічныя, у росквіце свайго працоўнага ўзросту. Перад кожным Аляксандр Лукашэнка паставіў канкрэтныя задачы — не самыя простыя, але тым не менш рэальныя.

Ірына КАСЦЕВІЧ, назначана міністрам працы і сацыяльнай абароны:

— На 2017 год стаіць задача па стварэнні 70 тысяч новых працоўных месцаў, і гэтыя працоўныя месцы павінны быць сучаснымі, якаснымі, эфектыўнымі, з адпаведным узроўнем заработнай платы. Да канца года не менш за 1000 рублёў павінна складаць заработная плата ў цэлым па эканоміцы. Задача, безумоўна, складаная. Урад цяпер працуе над яе вырашэннем. Што да пенсійнага забеспячэння, то гэта таксама даходы насельніцтва. Задача — не менш за 40% ад сярэднямесячнай заработнай платы па краіне.

Уладзімір КАРПЯК, назначаны памочнікам Прэзідэнта — галоўным інспектарам па Мінску:

— Мінск — гэта прамысловы горад, цэнтр нашай краіны. Адпаведна, ён павінен быць прыгожым горадам, куды хацелася б прыехаць. Таму ў першую чаргу — гэта навядзенне парадку ў горадзе. Другі момант — работа жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Трэцяе — мы казалі пра тое, што неабходна ствараць новыя працоўныя месцы, але самае галоўнае — захаваць тое, што ў нас ёсць.

Руслан ЕСІН, назначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Японіі:

— У сваёй рабоце я працягну тую лінію, якую праводзілі нашы калегі. Яны актыўна прасоўвалі нашы палітычныя інтарэсы, эканамічныя, гуманітарныя. Сёння кіраўнік дзяржавы паставіў канкрэтныя задачы па ўсіх кірунках двухбаковага супрацоўніцтва. Пры гэтым, безумоўна, эканамічная дыпламатыя — гэта той важны вектар, які для нас сёння ўяўляе найбольшую цікавасць. Перш за ўсё, натуральна, гэта падтрымка і расшырэнне дыялогу з палітыкамі Японіі, далейшае выбудоўванне кантактаў з бізнесменамі, работа па прыцягненні інвестыцый з Японіі і пашырэнне рэгіянальнага супрацоўніцтва.

Андрэй СТРАЧКО, назначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Кыргызстане:

— Беларусь і Кыргызстан — традыцыйныя партнёры. У нас традыцыйна моцныя гандлёвыя сувязі. У плане перспектыўных праектаў асноўай стане кааперацыя. Летась мы адкрылі сумесную вытворчасць трактароў, плануем збіраць кожны год 400 штук. Працягваецца работа па стварэнні такой жа кааперацыйнай вытворчасці па зборцы нашых камбайнаў.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

КАСЦЕВІЧ Ірына Анатольеўна нарадзілася ў 1967 годзе ў Мінску. Скончыла ў 1989 годзе Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава, у 2002 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

У 1989—1992 гадах — інжынер-канструктар ЦНДІТК Мінскага навукова-вытворчага аб'яднання «Цэнтрсістэм». У 1993 годзе займала пасаду эканаміста Галоўнага вылічальнага цэнтра Дзяржкамстата Рэспублікі Беларусь. У 1993—1994 гадах — эканаміст I катэгорыі, вядучы эканаміст упраўлення статыстыкі матэрыяльных рэсурсаў Дзяржкамстата Рэспублікі Беларусь.

З 1994 па 2002 год была вядучым эканамістам, галоўным эканамістам, начальнікам упраўлення статыстыкі матэрыяльных рэсурсаў Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь. У 2002—2006 гадах — начальнік упраўлення статыстычнага планавання і арганізацыі статназіранняў Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь. З 2006 па 2008 год — намеснік міністра статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь.

У 2008—2015 гадах працавала першым намеснікам старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь.

Са студзеня 2015 года была намеснікам міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь.

Ад сельскай гаспадаркі да абароннага комплексу

Беларусь гатова развіваць кантакты з Егіптам ва ўсіх сферах. Гэта пацвердзіў Прэзідэнт нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з дзяржаўным міністрам ваеннай прамысловасці Егіпта Мухамадам Саідам аль-Асарам.

— Мы з Прэзідэнтам Егіпта дамовіліся пра многія аспекты супрацоўніцтва, — сказаў кіраўнік краіны. — Мы ў прынцыпе гатовы прадаставіць вам не толькі адпаведную дапамогу ў падрыхтоўцы кадраў, але і перадачу тэхналогій па ўсіх кірунках, якія вас цікавяць. Мы гатовы папярэдне і разам з перадачай тэхналогій ствараць там, у Егіпце, адпаведныя вытворчасці, развіваць іх разам з вамі, паступова лакалізуючы. Адным словам, забароненых тэм, як мы канстатавалі ў Егіпце, у супрацоўніцтве паміж нашымі краінамі няма, мы гатовы супрацоўнічаць па ўсіх кірунках — ад сельскай гаспадаркі да ваенна-прамысловага і абароннага комплексу.

Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і гэтай паўночнаафрыканскай краінай базіруецца ў асноўным на беларускім экспарце. У Егіпце працуюць зборачная вытворчасць грузавых аўтамабіляў МАЗ і дзве зборачныя вытворчасці трактароў МТЗ.

У пашыраным фармаце

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па арганізацыі справаздачы ўрада за 2016 год, падчас якой плануецца абмеркаваць тэндэнцыі і сітуацыю ў эканоміцы Беларусі.

Прэзідэнт лічыць мэтазгодным арганізоўваць гэта мерапрыемства пасля таго, як з'явяцца звесткі за першы квартал бягучага года. Такім чынам, на думку кіраўніка дзяржавы, будуць канчатковыя даныя статыстыкі, знешнеэканамічных паказчыкаў.

— Адкрыта пра гэта гавару, каб не атрымалася так, што мы недзе пакрытыкуем парадкам урад, прымем нейкія меры па ўрадзе, а на самай справе дынаміка станоўчая, — аргументаваў Аляксандр Лукашэнка.

Падчас нарады былі абмеркаваны форма і змест будучай справаздачы. Мерапрыемства даручана правесці ў пашыраным фармаце, на яго запросяць больш за 300 чалавек. У прыватнасці, большае прадстаўніцтва кіраўнік дзяржавы хоча бачыць з боку вертыкалі ўлады ў рэгіёнах, дырэктараў прадпрыемстваў і арганізацый — людзей, якія бачаць і ведаюць абстаноўку на месцах.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ПЕРШЫЯ ПАШПАРТЫ

У ходзе Усебеларускай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!» у Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пашпарты атрымалі 14-гадовыя беларусы з Магілёўскай і Мінскай абласцей. Ва ўрачыстай абстаноўцы дакументы ўручыў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

— Я мяркую, што атрыманне пашпарта — гэта такое мерапрыемства, якое запамінаецца на ўсё жыццё, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — У нашай краіне створаны ўсе неабходныя ўмовы для таго, каб асоба, каб маладыя людзі раскрываліся. Беларусь заўсёды была багатая на таленты і самародкі. І цяпер створаны больш камфортныя ўмовы для таго, каб гэты прыродна-генетычны патэнцыял атрымаў больш магутнае развіццё.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

■ З нагоды

НАЙВЫШЭЙШАЯ КАНСТЫТУЦЫЙНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ — ЧАЛАВЕК

Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь устаноўлена, што чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы; дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі і законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы.

Накіраванасць дзяржаўнай дзейнасці на забеспячэнне і абарону правоў і свабод чалавека і грамадзяніна з'яўляецца адным з важных прынцыпаў прававой дзяржавы. Абавязак дзяржавы забяспечваць і абараняць правы і свабоды чалавека замацаваны ў многіх артыкулах Асноўнага Закона і адрасаваны ўсім галінам дзяржаўнай улады. Пры гэтым адным з найбольш дзейсных сродкаў абароны правоў і свабод асобы з'яўляецца судовая абарона, якая гарантуецца артыкулам 60 Канстытуцыі кожнаму. У Рэспубліцы Беларусь судовая абарона правоў і свабод грамадзян забяспечваецца судамі агульнай юрысдыкцыі і Канстытуцыйным Судом, які згодна з Канстытуцыяй ажыццяўляе кантроль за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў у дзяржаве.

З палажэнняў Канстытуцыі вынікае, што судовая абарона правоў і свабод гарантуецца кожнаму, а гэта азначае адсутнасць якіх-небудзь абмежаванняў кола асоб, якія прэтэндуюць на такую абарону. Канстытуцыйныя нормы не змяшчаюць таксама абмежаванняў у правах і свабодах, якія падлягаюць судовай абароне, у сувязі з чым судовай абароне падлягаюць правы і свабоды асобы незалежна ад таго, замацаваны яны ў Канстытуцыі, законах або прадугледжаны міжнароднымі абавязацельствамі краіны. Такім чынам, права на судовую абарону можа быць выкарыстана грамадзянінам ва ўсіх выпадках, калі парушаюцца ці аспрэчваюцца яго правы.

Выкладзенае сведчыць аб прававой і фактычнай каштоўнасці права на судовую абарону, паколькі дазваляе грамадзянам рэалізаваць іншыя канстытуцыйныя правы, а ў выпадку неабходнасці атрымаць абарону парушаных правоў, свабод і ахоўваемых законам інтарэсаў.

Адным з найважнейшых складнікаў права на судовую абарону з'яўляецца даступнасць правасуддзя, сутнасць якой заключаецца ў адсутнасці неабгрунтаваных прававых і практычных перашкод для звароту ў суд, разгляду і вырашэння спраў. У выпадку, калі нормы закона перашкаджаюць рэалізацыі права на судовую абарону ў поўным аб'ёме, спрацоўваюць механізмы канстытуцыйнага кантролю, якія забяспечваюць законнасць як у праватворчасці, так і ў правапрымяненні.

Так, у прынятым Канстытуцыйным Судом рашэнні «Аб праве на абскарджанне рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб» звернута ўвага на тое, што асоба, указаная ў акце праверкі падатковага органа як асоба, якая дапусціла сваімі дзеяннямі (бяздзейнасцю) парушэнне падатковага заканадаўства, але спыніла працоўныя адносіны з арганізацыяй-даўжніком, у адпаведнасці з Падатковым кодэксам права на абскарджанне такога рашэння не мае.

Разам з тым згодна з Канстытуцыяй дзяржава абавязана забяспечыць рэалізацыю канстытуцыйнага права на зварот у дзяржаўныя органы (артыкул 40) і доступ да правасуддзя кожнай асобе (артыкул 60), чые правы і законныя інтарэсы якой закранаюцца рашэннямі падатковых органаў, дзеяннямі (бяздзейнасцю) іх службовых асоб.

Канстытуцыйны Суд прыйшоў да высновы, што дзеючае прававое рэгуляванне не можа быць прызнана дастатковым для забеспячэння поўнай і эфектыўнай судовай абароны правоў і свабод як неабходнага элемента канстытуцыйна-прававога рэжыму, заснаванага на прынцыпах вяршэнства права і прававой дзяржавы. У сувязі з гэтым было прызнана неабходным устараненне заканадаўцам указанага прабелу ў рэгуляванні права на абскарджанне рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб шляхам унясення ў Падатковы кодэкс змяненняў, якія прадугледжваюць права кожнай асобы на абскарджанне рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб, калі, па меркаванні асобы, такія рашэнні, дзеянні або бяздзейнасць парушаюць яе правы і законныя інтарэсы.

Гэтае рашэнне Канстытуцыйнага Суда выканана заканадаўцам шляхам выкладання артыкула 85 Падатковага кодэкса ў новай рэдакцыі, што ўлічвае прававую пазіцыю Канстытуцыйнага Суда.

У заключэнне важна адзначыць, што Канстытуцыя — Асноўны Закон, які не толькі замацоўвае нормы, па якіх дзяржава і грамадства жывуць у цяперашні час, але і вызначае шляхі развіцця Рэспублікі Беларусь на доўгатэрміновую перспектыву як дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы, у якой чалавек — найвышэйшая каштоўнасць грамадства і дзяржавы.

Тадэуш ВАРАНОВІЧ,
суддзя Канстытуцыйнага Суда
Рэспублікі Беларусь

■ Медыяпрастора

Не спекуляваць фактамі

Журналіст не валодае манаполіяй на праўду і не мае права спекуляваць фактамі. Пра гэта гаворыцца ў заяве Беларускага саюза журналістаў, прынятай на пасяджэнні сакратарыята БСЖ пры разглядзе пытання асвятлення ў СМІ тэмы Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства».

Беларускі саюз журналістаў заклікае калег прытрымлівацца асноватворных прынцыпаў журналістыкі пры асвятленні тэм, што закранаюць інтарэсы розных бакоў і палітычных груп, паведамляе БЕЛТА. Як гаворыцца ў заяве, «аналіз медыйнага поля ў кантэксце асвятлення дэкрэта паказаў, што фактычна асобныя прадстаўнікі медыйнай сферы адкрыта занялі бок так званай пазасістэмнай апазіцыі. Пры гэтым, прыкрываючыся прынцыпамі свабоды слова, сталі актыўнымі ўдзельнікамі пратэстных акцый. У некаторых СМІ была скажоная галоўная ідэя дэкрэта — прадухіленне сацыяльнага ўтрыманства».

Акрамя таго, БСЖ звяртае ўвагу на асаблівую актыўнасць асобных замежных інтэрнэт-рэсурсаў і замежных СМІ, не маючых акрэдытацыі ў Беларусі, якія імкнуцца навязаць беларускаму грамадству свой пункт гледжання на грамадска-палітычныя і сацыяльныя працэсы ў нашай краіне.

У заяве выказваецца перакананасць, што нацыянальная інфармацыйная прастора павінна кансалідаваць грамадства на рашэнне актуальных праблем, утрымліваецца заклік аб захаванні нормаў журналісцкай этыкі пры асвятленні пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця

НЕ ЗАЖЫВАЕ РАНА ТРАСЦЯНЦА...

Беларускія і нямецкія гісторыкі сумесна асэнсавалі трагічныя старонкі агульнай гісторыі

Трагедыя Трасцянца — чацвёртага па велічыні лагера смерці ў свеце — стала адкрыццём для замежнай грамадскасці. У той час як беларусы ўжо больш як 70 гадоў аплакваюць ахвяр, для якіх невялікая тэрыторыя, што на ўскрайку сучаснага Мінска, ператварылася ў брацкую магілу, жыхары многіх еўрапейскіх краін, чые продкі ў тым ліку знайшлі ў Трасцянцы апошні прытулак, да нядаўняга часу не ведалі, дзе абарвалася жыццё блізкіх ім людзей...

Тое, што трасцянецкая трагедыя прагучала ў міжнародным маштабе, — перш за ўсё заслуга беларускіх і нямецкіх гісторыкаў, навукоўцаў. Агульнымі намаганнямі праведзены даследаванні, вынікамі якіх сталі шматлікія міжнародныя навуковыя канферэнцыі. Беларускія даследчыкі расказваюць пра лагер смерці ў Еўропе, замежныя — перадаюць нам інфармацыю аб дэпартаваных у Мінск заходнееўрапейскіх яўрэях... Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, а таксама з фінансавай дапамогай нямецкага боку ў Трасцянцы ідзе будаўніцтва сучаснага мемарыяльнага комплексу.

Наступны крок у справе захавання памяці аб ахвярах лагера смерці — адкрыццё перасоўнай выстаўкі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Экспазіцыю ўжо бачылі ў нямецкіх гарадах, цяпер чарга беларусаў больш паглыблена даведацца аб тым, што адбывалася на нашай зямлі больш як сем дзесяцігоддзяў таму.

— Для Беларусі, якая ў гады Другой сусветнай вайны страціла кожнага трэцяга жыхара, ушанаванне памяці ахвяр нацызму — неад'емная частка дзяржаўнай палітыкі, — зазначыў падчас адкрыцця выстаўкі **намеснік міністра замежных спраў Беларусі Алег КРАЎЧАНКА.** — Стварэнне мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» знаходзіцца ў фокусе ўвагі кіраўніцтва краіны і асабіста Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. У Трасцянцы неразрыўна спляліся лёсы тысяч жыхароў Еўропы. Экспазіцыя выстаўкі ўяўляе сабой добры прыклад паспяховага супрацоўніцтва Беларусі і Германіі ў сумесным асэнсаванні трагічных старонак агульнай гісторыі. Сумесная сістэмная работа па супрацьдзеянні адраджэнню нацызму павінна заставацца важным прыярытэтам міжнароднага парадку дня.

Дзяржаўны міністр па еўрапейскіх справах Федэральнага міністэрства замежных спраў Германіі Міхаэль РОТ лічыць вельмі важным нагадаць аб непамерных пакутах ахвяр фашызму, аддаць даніну памяці загінулым у гады вайны і ўсвядоміць, што такое злачынства супраць чалавечнасці больш не павінна паўтарыцца. «Такое трансгранічнае супрацоўніцтва гісторыкаў — не само сабой зразумелы факт, — лічыць Міхаэль Рот. — Занадта доўга гэтыя злачынствы выцясняліся з нашай памяці. Сёння мы павінны памятаць і нагадваць аб тым, што адбывалася ў Трасцянцы. Гэта наш доўг перад народамі, якія найбольш пацярпелі ад нацыянал-сацыялістычнага рэжыму. Сумеснае сістэматычнае асэнсаванне тых падзей з'яўляецца не толькі рухальнай сілай паміж Мінскам і Берлінам, але і крокам да прымірэння паміж нашым грамадствам».

Выстаўку робіць акцэнт на малавядомых аспектах трасцянецкай трагедыі. Не столькі расказваецца пра гісторыю лагера смерці, колькі аб лёсах канкрэтных людзей, чыё жыццё тут абарвалася. У Трасцянцы загінулі і бацькі Курта Маркса. Сын дэпартаваных з Германіі яўрэяў прыехаў у Мінск, каб расказаць, што Трасцянец — гэта боль не толькі беларусаў. Ён нарадзіўся ў 1929 годзе ў Кёльне. Хадзіў у яўрэйскую школу. Пасля пагромаў так званай Крыштальнай ночы ў 1938 годзе разам з 130 дзецьмі яго вывезлі ў Лондан. Развітваючыся з бацькамі, хлопчык не сумаваў: у хуткім часе сям'я павінна была ўз'яднацца ў Амерыцы. Але лёс распарадзіўся інакш: бацькі Курта былі ў тым цягніку, які рушыў у Трасцянец. Яны нават заплацілі за білеты...

— Апошні ліст, які я атрымаў ад іх, быў дасланы ў ліпені 1942 года, — расказвае Курт Маркс. — У мяне якраз быў дзень нараджэння... Яны мяне віншавалі. І ўсё, больш лістоў не прыходзіла. Сёння мы ведаем чаму...

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

Фота Яўгена ПРЯСЕЦКАГА.

НЕ СТОЙ ПАД СТРАЛОЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наступнае здарэнне адбылося ў Віцебску. Там рамантавалася адна з кацельняў. На будаўнічую пляцоўку прыгналі аўтамабільны кран. Ён мусіў дэмантаваць стары комін. Але скончылася ўсё тым, што кран страціў устойлівасць і перакуліўся. Здавалася, як жа такое магло здарыцца са шматтоннай махінай? Падчас разбору сітуацыі высветлілася, што пад задняй левай апорай крана прасеў грунт. Да таго ж сам кран працаваў з істотнай перагрузкай. Але гэта прычыны тэхнічнага характару. Так бы мовіць, вынік памылковых арганізацыйных дзеянняў. Яны суправаджалі працэс ад самага пачатку і, наслаіўшыся адно на адно, аўтаматычна прывялі да таго, што адбылося. Няправільна выбралі пляцоўку для размяшчэння і ўстаноўкі крана. Падчас складання тэхналагічнай схемы апускання дэмантаванага коміну дапушчаны памылкі. Калі ўжо кран пачаў працаваць, то ў частцы выбару рэжыму работы быў няправільна настроены абмежавальнік грузапад'ёмнасці.

Чытаеш сухія радкі справаздачы і задаешся пытаннем: як можна было дапусціць столькі памылак на адным участку работы? Добра яшчэ, што і машыніст аўтакрана не пацярпеў, і перакуленым кранам нікога з людзей не зачапіла.

Яшчэ адна няштатная сітуацыя, гэтым разам ужо з казловым кранам, адбылася на ўчастку перагрузкі кантэйнераў філіяла «Белтрансгрузлагістык» Брэсцкага аддзялення Беларускай чыгункі. Машыніст крана перамяшчаў адзін з кантэйнераў, і ў нейкі момант нешта адбылося з мостам крана. Ён дэфармаваўся, і шматтонны кантэйнер імгненна апусціўся на зямлю.

Па гэтым факце распачалося расследаванне. Яно і паказала, што тэхнічнай прычынай здарэння стала наяўнасць асаблівасцяў канструкцыі і тэхналогіі вырабу металаканструкцыі моста крана. Звышнарматыўныя значэнні цвёрдасці сталі ў лакальных кропках былі перавышаны. Як следства, пластычнасць металу стала вельмі нізкай. У зварных злучэннях крана з'явіліся трэшчыны, якія пачалі распаўсюджвацца з лавінападобнай хуткасцю. Яны распаўсюдзіліся і на канструкцыю самога моста.

Яшчэ адно здарэнне з выкарыстаннем крана летась адбылося на будоўлі шматпавярховага дома ў Мазыры. Праўда, дакладней будзе сказаць, што здарылася гэта падчас мантажу вежавага пад'ёмніка. Невядома чаму страла крана задзёрлася ўгору. У выніку істотна пацярпеў сам агрэгат. У яго пагнулася секцыя, а супрацьвага стралы была дэфармавана.

Праўда, што менавіта стала прычынай гэтай надзвычайнай сітуацыі, пакуль невядома. Расследаванне праводзіцца і дагэтуль.

У пачатку сакавіка ў Мінску прайшоў адмысловы семінар, падчас якога абмяркоўваліся актуальныя пытанні дзяржаўнага нагляду за бяспекай пад'ёмных збудаванняў і атракцыёнаў. Акрамя тэарэтычных ведаў, спецыялісты адпрацавалі праверку спраўнасці прыбораў і прылад бяспекі грузапад'ёмных кранаў.

Прафілактыка — перш за ўсё

Кожны інцыдэнт з выкарыстаннем кранаў у любым разе цягне за сабой выдаткі. У лепшым выпадку гэта прастой тэхнікі і яе рамонт, які можа выліцца ў вельмі кругленькую суму. У найгоршым — церпяць людзі. І таму адзінае выйсце для таго, каб мінімізаваць наступствы надзвычайнага выпадку, — гэта яго прафілактыка. Як жа займаюцца гэтым спецыялісты Дзяржпрамнагляда?

— Пасля кожнага надзвычайнага выпадку і інцыдэнту мы рыхтуем адмысловы інфармацыйны ліст, — расказвае Пётр Клімко. — Ён накіроўваецца ў адпаведныя міністэрствы і ведамствы, а таксама суб'екты гаспадарання. У гэтых лістах мы ўказваем на неабходнасць выканання машыністамі грузапад'ёмных кранаў, стропальшчыкамі патрабаванняў правілаў па забеспячэнні прамысловай бяспекі грузапад'ёмных кранаў і іншых тэхнічных нарматыўна-прававых актаў, якія рэгламентуюць сферу вытворчасці і ўстаноўкі стралавых самаходных кранаў для выканання работ паблізу катлаванаў, ліній электрапередачы, у абмежаваных умовах.

Мы адзначаем недапушчальнасць прызначэння спецыялістамі, якія не прайшлі ва ўстаноўленым парадку працэдуру павышэння кваліфікацыі, допуску неспецыялістаў да выканання работ па страпоўцы грузаў.

Таксама падчас прафілактыкі мы звяртаем асаблівую ўвагу на неабходнасць распрацоўкі суб'ектамі прамысловай бяспекі палажэння аб парадку арганізацыі і ажыццяўлення вытворчага кантролю ў галіне прамысловай бяспекі, а таксама стварэння структурнага падраздзялення, адказнага за ажыццяўленне вытворчага кантролю. Гэтыя патрабаванні прад'яўляюцца ў адпаведнасці з артыкулам 29 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прамысловай бяспецы».

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by
Фота прадастаўлена Дзяржпрамнаглядам.

■ Блізкая ўлада

Дыялогі аб праблемах і аб жыцці

У суботу прайшла сумесная прамая лінія нашай газеты і Слуцкага райвыканкама. На званкі адказваў першы намеснік старшыні, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ЛЕШЧАНКА.

Першым патэлефанаваў Буцько Анатоль Канстанцінавіч з вёскі Бярозаўка. Пенсіянер не задаволены тым, што ў прыдарожнай паласе пачалі высякаць дрэвы.

— Я ж нарадзіўся ў гэтай вёсцы, бачыў гэтыя бярозы і таполі ўсё жыццё...

— Гэта робіцца, каб навесці санітарны парадак, — пачынае тлумачыць Уладзімір Лешчанка.

— ...А яшчэ я не разумею, чаму не апрацоўваецца ўчастак зямлі на тэрыторыі Вясейскага сельсавета, — працягвае абурацца Анатоль Канстанцінавіч.

— Дзякуй за падказку, абавязкова дашлём землеўпарадкавальную службу, няхай паглядзяць.

У канцы размовы пенсіянер папрасіў дапамагчы яму атрымаць зерне для курэй. Паводле слоў Уладзіміра Лешчанкі, з гэтым праблем няма, дастаткова пад'ехаць у мясцовую гаспадарку і выпісаць тое зерне. «Гэта нядорага. Але, наколькі я зразумею, пенсіянер хоча атрымаць яго бясплатна. Вы ж чулі, успамінаў часы развітога сацыялізму...»

Каб не марнаваць дарэмна час у адсутнасць званкоў, Уладзімір Яўгенавіч праглядае спісы.

— Вось тут, бачыце, выдзелены тыя гаспадаркі, дзе пачалася пасяўная. Падкормліваюцца азімыя збожжавыя, уносіцца арганіка... Не ўсюды сёння магчыма гэта рабіць, бо ёсць пераўвільгатненні. Але там, дзе землі лёгкія, дзе тэхніка можа прайсці, работа ідзе поўным ходам. ...За гадзіну адзін званок — не густа. Усе ўжо, пэўна, паехалі на лецішча грэбсці старое лісце. У нас жа апошнім часам на прамыя лініі тэлефануюць пераважна гараджане. Ёсць заўзятыя скаржнікі. Чалавек дзесяць, якія на ўсе прыёмы прыходзяць. Лад жыцця ў іх такі. Не разумею, як можна марнаваць свой час і нервы на тое, каб гадамі адсуджваць у суседзяў 12 сантыметраў зямлі. Мы падлічылі, там атрымліваецца 0,2 соткі ад сілы. Такі мізер. А жанчына ўсё адно ходзіць і даказвае сваю праўду. І раённы і абласны суды ёй адмовілі. Усё роўна ходзіць. Вось нядаўна тэлебачанне выклікала, прыязджалі, здымалі сюжэт...

(Раздаецца званок).

— Добры дзень, што гэта нарабілася, што ў нас у Замосці магазін закрылі? Ужо тыдзень закрыты.

— Разбяромся, Кіра Аляксандраўна.

— Уладзімір Яўгенавіч, пастарайцеся, тут ужо мы ўсе старыя бабы бушуем. Прадаўшчыцы кажуць, што мала ім плацяць, 200 рублёў, дык яны ўзялі і кінулі працу.

— Гэта тэлефанавала Барушка Кіра Аляксандраўна, якая ўсё жыццё адпрацавала медработнікам. Я яе па голасе пазнаў, — тлумачыць мне Уладзімір Лешчанка і тут жа набірае нумар прадстаўніка аддзела гандлю, просіць прыняць меры.

Праз некалькі секундаў раздаецца трэці званок. Тэлефануе Бухал Людміла Мікалаеўна, якая жыве ў Слуцку на вуліцы Савецкай.

— Раней на Леніна святло ўсю ноч гарэла. Перад Новым годам адключылі. Хачу, каб зноў святло ўсю ноч гарэла.

— На жаль, не можам задаволіць ваша жаданне. Эканомім.

— Дык ужо за 3 месяцы крыху сэканомілі. Я ж не прашу па ўсім горадзе ўключаць святло, хоць бы на цэнтральнай вуліцы.

— Да 24.00 будзем уключаць увечары святло. Спаць горад павінен ноччу.

— Хацелася б, каб усю ноч. Бо людзі ідуць на працу. Мой муж, у прыватнасці, у 3 ночы ідзе на працу.

— Калі цёмна ісці на працу, то ліхтарык можа набыць. У адносінах крыміналу горад ціхі, я не чуў, каб кагосьці ноччу пабілі, абакралі.

— І колькі будуць эканоміць? Усё жыццё? Ці хаця б паўгода мо дастаткова...

— Усё жыццё.

— Тады хоць бы на Савецкай уключыце да 24.00.

— Я ж сказаў: па ўсім горадзе да 24.00.

— Савецкая адключаецца цяпер у 21.45.

— У пятніцу на пасяджэнні выканкама прынялі рашэнне — адрэгуляваць асвятленне горада ў сувязі з павелічэннем светлавога дня. Начальнік міліцыі папрасіў да 24.00 уключаць электраэнергію ў сувязі з тым, што моладзь гуляе.

— Добра. Калі на Савецкай раптам не ўключаць да 24.00, то я спашлюся на вашы словы.

Паклаўшы трубку, Уладзімір Лешчанка згадаў рэальную сітуацыю з жыцця ў тэму. «Шмат гадоў таму ў вёсцы людзі пачалі патрабаваць у кіраўніцтва ўстанавіць ліхтары. Бюджэт напружаны. Цяжка было. Грошай не хапала. Кіраўніцтва не стала пярэчыць: «Хочаце ліхтары каля дома? Добра. Мы дадзім указанне энергетыкам паставіць каля кожнай хаты па ліхтары з лічыльнікамі і выключальнікамі. Хочаце, хоць у тры гадзіны ночы ўключайце святло. Але лічыльнік круціцца і вы за яго плаціце». — «Ай не, не трэба», — пачулі ў адказ».

Як адзначыў Уладзімір Лешчанка, колькасць зваротаў грамадзян у райвыканкам скарацілася прыблізна на 25—30%.

Некалькі пытанняў было звязана з працаўладкаванем. «Напружанасць крыху з працай у горадзе, ідуць невялікія скарачэнні людзей, аптымізацыі на прадпрыемствах. Многія незадаволеныя, што так атрымліваецца ў жыцці. Стараемся людзей працаўладкаваць. З аднаго месца пераводзім на іншае, калі трэба, перавучваем бясплатна. На нашай біржы працы ёсць дзесьці каля 160 вакансій.

Акрамя таго, у нас створана асобная камісія, якая, абапіраючыся на дэкрэт №3, разглядае індывідуальна кожную заяву, размаўляе з людзьмі. Многім, у каго сапраўды складаная жыццёвая сітуацыя, ідзём насустрач і вызваляем ад падатку. Маё ж меркаванне такое: працаздольны чалавек павінен працаваць і плаціць падаткі. Дабротамі дзяржавы карыстаюцца ў тым ліку і так званыя «лайдакі ці ўхілісты» (лечацца, дзеткі, дзякуй богу, у школу ходзяць, жыллёва-камунальныя паслугі, як і ўсе беларусы, не ў поўным аб'ёме аплачваюць...), а працаваць не хочуць. Ты ж з агульнага катла ясі, а ў гэты кацёл нічога не кладзеш. Гэта несправядліва. З іншага боку, вядома, дзяржава павінна даць магчымасць працаўладкавацца. Над гэтым сёння асабліва працуем».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК. *nadzieja@zviazda.by*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЭВАЛЮЦЫЯ ЦТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мяркую, не зраблю вялікага адкрыцця ў педагогіцы, калі засведчу, што экзамен у любой яго форме (вуснай, пісьмовай ці тэставай) павінен выконваць кантрольную функцыю. Безумоўна, вусны экзамен — гэта класіка вучэбнага працэсу. Але для маніторынгу вялікай колькасці экзаменуемых, пры ўмове высокага ўзроўню аўтаматызацыі працэсаў падрыхтоўкі і апрацоўкі матэрыялаў, больш падыходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне.

Суадносіны адкрытых і закрытых заданняў дасягнулі сваёй мяжы, каб можна было захаваць аўтаматызаваную апрацоўку бланкаў адказаў у ранейшыя тэрміны.

На ЦТ у аснову методыкі разліку тэставага бала пакладзена стабальная шкала, якая дазваляе не толькі прыняць пад увагу колькасць правільна выкананых заданняў тэста, але і ўлічыць адносную складанасць кожнага выкананага ці нявыкананага задання. Рэйтынгавая сістэма вельмі добра спрацоўвае ва ўмовах высокіх конкурсаў, аднак для выніковай атэстацыі яна не падыходзіць. У нас, каб не заахвочваць муштраванне па тэстах, выпускныя экзамены пасля школы захаваліся ў традыцыйнай форме. Але колькі б мы ні казалі, што цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта не выпускны экзамен за курс сярэдняй школы, а конкурсны адбор ахвотных працягнуць навучанне на больш высокай (!) ступені адукацыі, тэставы бал у сертыфікаце па-ранейшаму параўноўваюць з адзнакай у школьным атэстаце, спрабуюць праводзіць паралелі. А гэта абсалютна няправільна...

Спрашчаць ці ўскладняць?

— Падводзячы вынікі апошняй прыёмнай кампаніі, грамадскасці паведамілі, што Міністэрствам адукацыі разглядаюцца розныя варыянты ўдасканалення як зместу тэстаў, у тым ліку з выкарыстаннем перадавога міжнароднага вопыту. А якім шляхам ідуць іншыя еўрапейскія краіны? Дзе-небудзь яшчэ засталіся вусныя экзамены пры паступленні?

— Зазначу, што і змест, і структура, і форма тэставых заданняў удасканальваюцца на працягу ўсяго часу правядзення ў нашай краіне ЦТ. Гэта бесперапынны працэс. І мы дасягнулі ў гэтым плане пэўных поспехаў. Нашы тэставыя заданні неаднойчы праходзілі экспертызу ў міжнародных спецыялістаў і атрымалі ад іх станоўчую адзнаку. Мы, у сваю чаргу, вывучаем вопыт іншых краін у падыходах да стварэння заданняў, арганізацыі і правядзення іспытаў у тэставай форме.

Іспыты, як выпускныя, так і ўступныя, у большасці краін свету праходзяць пісьмова ў форме розных тэстаў. «Заканадаўцамі моды» выступаюць сусветныя арганізацыі, якія праводзяць розныя педагагічныя даследаванні адначасова ў многіх краінах у тэставай форме. Напрыклад, толькі тэставыя тэхналогіі выкарыстоўваюцца ва ўсіх маніторынгавых і параўнальных міжнародных даследаваннях: PISA, TIMMS і PIRLS. Гэта стымулюе да ўніфікацыі формаў экзаменаў на ўзроўні асобных краін, што, у сваю чаргу, дазваляе затым экспертам аб'ектыўна параўноўваць вынікі вялікай колькасці ўдзельнікаў іспытаў.

— Мікалай Сцяпанавіч, асобныя педагогі з гімназій і ліцэяў са шкадаваннем канстатуюць, што тэсты па фізіцы і матэматыцы сталі занадта лёгкімі. Некаторыя лічаць, што тэсты павінны ўтрымліваць заданні, да якіх трэба даваць поўныя, доказныя рашэнні, бо матэматыка без доказаў — не матэматыка. А арыентацыя на адны адказы дрэнна адбіваецца на тэхналогіі навучання ў школе.

— Між іншым, былі часы, калі нас папракалі ў занадта складаных заданнях па згаданых прадметах. Кожны год мы карэктуем нашы тэсты, каб «дагадзіць» так званаму сярэднестатыстычнаму абітурыенту. Аналізуем вынікі абітурыентаў папярэдняга года, вынікі ўдзельнікаў усіх трох тураў рэпетыцыйнага тэсціравання... Задача, як вы разумееце, няпростая, і, каб вырашыць яе, часам даводзіцца крыху зніжаць складанасць некаторых заданняў. Але тэсты проста не будуць спраўляцца са сваёй задачай па ранжыраванні абітурыентаў, калі яны будуць вельмі складанымі або, наадварот, вельмі лёгкімі.

Спецыялісты інстытута штогод праводзяць абнаўленне зместу (мадэляў, тыпаў і формаў заданняў) тэстаў на 15—20%. Гэта робіцца як з мэтай паступовай ратацыі заданняў і максімальнага ахопу зместу ўсяго курса, так і для супрацьдзеяння прыёмам муштравання абітурыентаў з боку асобных настаўнікаў і рэпетытараў. Пры гэтым бярэцца пад увагу той факт, што ў нас няма так званай ручной праверкі работ, а ідзе іх машыннае сканіраванне. Напрыклад, з самага пачатку ажыццяўляецца віртуальнае раздзяленне кожнага бланка адказу на вобласць рэгістрацыі, субтэсты А і В. Таму заданні павінны быць складзены такім чынам, каб ніякія выпадковыя фактары не паўплывалі на якасць праверкі, а камп'ютарныя праграмы маглі распазнаць усё, што напісаў абітурыент у бланку.

Ці ёсць месца ў нашых тэстах доказам, напрыклад, тэарэм па матэматыцы? Хачу падкрэсліць, што асобныя меркаванні аб тым, што тэставыя заданні пазбаўлены магчымасці праверыць творчыя здольнасці абітурыентаў, — загадзя памылковыя. Вынік творчай дзейнасці любога чалавека — гэта прымяненне на практыцы набытых ведаў і сфарміраваных уменняў. Нават пры вызначэнні ў тэставым заданні патрэбы ў шпалерах для рамонту кватэры абітурыент звяртаецца да формулы, па якой вызначаецца плошча прамавугольніка. Гэта значыць, прымяняе раней набытыя прыёмы творчай дзейнасці. І нельга пагадзіцца, што заданне, дзе трэба знайсці залежнасць відавога складу расліннасці ад тыпу глебы, тэмпературных паказчыкаў і колькасці вільгаці, будзе творчым, а квадратнае ўраўненне тыпу ax2+bx+c=0 — не творчым.

Між тым ці ёсць увогуле патрэба ў праверцы так званых творчых здольнасцяў абітурыента? Падчас экзамену правяраць трэба пэўныя веды, уменні і навыкі, якімі авалодаў абітурыент за час навучання. Пазнавальны працэс у гэтым выпадку не можа быць аб'ектам кантролю, гэта толькі сродак авалодання ведамі і навыкамі. А найбольш падыходзячы фармат для выяўлення «таленавітых неардынарных асоб» — алімпіядны рух. Разам з тым я не прыгадаю ніводнага выпадку, каб пераможцы алімпіяд былі аўтсайдарамі на цэнтралізаваным тэсціраванні.

Што тычыцца, як вы кажаце, «стандарту навучання матэматыцы», то прыемна адзначыць, што нашы тэставыя заданні ўсё часцей сустракаюцца ў падручніках і вучэбных дапаможніках. Ці гэта не прыклад прызнання іх якасці?

Угадаць ці падумаць?

— Адно з самых распаўсюджаных абвінавачанняў у бок ЦТ — наяўнасць у тэстах заданняў з варыянтамі адказаў, дзе правільны адказ быццам бы можна ўгадаць. Расіяне ад такіх заданняў цалкам адмовіліся. Можа, і нам ёсць сэнс пакінуць у тэстах толькі воблась В?

Спецыялісты інстытута штогод праводзяць абнаўленне зместу (мадэляў, тыпаў і формаў заданняў) тэстаў на 15—20%.

— Мы скарацілі ў тэстах частку А, пашырыўшы частку В настолькі, наколькі дазваляе тэхналогія. Суадносіны адкрытых і закрытых заданняў дасягнулі сваёй мяжы, каб можна было захаваць аўтаматызаваную апрацоўку бланкаў адказаў у ранейшыя тэрміны.

З пункту гледжання тэорыі верагоднасці, пэўны шанс на выпадковы правільны адказ існуе. Аднак нашы разлікі сведчаць, што гэты паказчык вельмі маленькі і не можа ўплываць на агульны вынік асобнага абітурыента. Хачу заўважыць, што заданні субтэста А (а іх усяго 18) даволі просценькія, таму маюць вельмі малы ацэначны каэфіцыент — у межах 1.0 за кожнае з іх. У такім выпадку прасцей рашыць задачу, чым займацца вынаходніцтвам методыкі ўгадвання.

Між іншым, Вышэйшая школа бізнесу ў Лондане прапануе сваім абітурыентам падчас ўступных іспытаў тэст з 30 заданняў. І ўсе заданні толькі з вобласці А, гэта значыць, з варыянтамі адказаў. А меркаванні, што заданнямі ў частцы В веды абітурыента правяраюцца лепш, чым часткай А, не падмацаваны ніякай аналітыкай. Больш таго, мы часта сутыкаемся з тым, што аднатыповыя заданні абітурыенты лепш выконваюць у заданнях часткі В. Вельмі падобныя дыстрактары часта заблытваюць абітурыентаў, тым больш у тэстах па мовах, дзе можа быць некалькі правільных адказаў. Нават з двух варыянтаў складана выбраць правільны, а што казаць, калі праўдападобных дыстрактараў 4—5? Угадаць можна, толькі калі ведаеш матэрыял...

Няспраўджаныя чаканні

— А што мог бы даць у плане павелічэння творчага складніка тэста субтэст С? Ці аналізавалі вы, якую армію экзаменатараў трэба было б прыцягнуць да праверкі экзаменацыйных работ, каб правесці ўступную кампанію ў тыя ж тэрміны, што і цяпер?

— Субтэсты А і В — гэта не вынаходніцтва нашага інстытута, а сусветная практыка: тэставыя заданні адкрытага і закрытага тыпу цалкам адпавядаюць тэхналогіям тэсціравання. А вось субтэст С — кампанент традыцыйнай экзаменацыйнай сістэмы ў мініяцюры (кароткае выкладанне зместу пэўнага працэсу, з'явы або кароткая характарыстыка зместу літаратурнага твора). І яго ніяк нельга аднесці да тэсціравання, бо пры ўсім жаданні аўтаматычная апрацоўка субтэста С немагчымая. Правяраць яго і выстаўляць адзнакі павінны экзаменатары.

Вельмі шмат пытанняў і да крытэрыяў ацэньвання, і да падрыхтоўкі спецыялістаў, якія правяраюць работы і выстаўляюць адзнакі. У Расіі такіх спецыялістаў рыхтуюць на працягу года, пасля чаго яны здаюць адпаведныя экзамены. У маленькай Літве на праверцы часткі С задзейнічаны 800 чалавек, у нашай краіне спатрэбіцца каля трох тысяч чалавек, каб выканаць праверку тэстаў у вызначаны тэрмін. А самае галоўнае, што пры ручной праверцы тэставых работ з'яўляецца пралаз для карупцыйных праяў. Пры ўсіх нашых намаганнях па іх мінімізацыі вельмі цяжка будзе пераканаць грамадства ў аб'ектыўнасці ручной праверкі, пойдзе цэлы шэраг апеляцый. Нездарма ў свеце практычна адмовіліся ад часткі С у тэстах: эфект нязначны, бо вынікі часткі С, як правіла, карэлююць з часткамі А і В, а затраты на яе падрыхтоўку і правядзенне велізарныя. У той жа Расіі да выканання субтэста С прыступае менш за палову абітурыентаў, гэта значыць, што ён не выконвае той функцыі, на якую разлічаны. Расійскія філолагі лічаць, што 50 працэнтаў эсэ, напісаных на адзіным дзяржаўным экзамене па рускай мове, — гэта набор гатовых фраз, якія падыходзяць да любой тэмы. Імітацыя разважанняў. Яны толькі нагадваюць тэксты, хоць імі насамрэч не з'яўляюцца.

Уводзіць субтэст С для ўсіх, я лічу, абсалютна нерацыянальна. Між тым у нашай краіне дастаткова паспяхова выкарыстоўваюцца ўступныя іспыты ва ўніверсітэтах на так званыя творчыя спецыяльнасці: музыка, вакал, харэаграфія, архітэктура, журналістыка... Што тычыцца іншых прапаноў па ўдасканальванні формы ўступных іспытаў, то зазначу, што кіраўніцтвам Міністэрства адукацыі вядзецца пэўная работа ў гэтым кірунку.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Фінансы

ЗВР: УЖО БОЛЬШ ЗА 5 млрд ДОЛАРАЎ

У адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду золатавалютныя рэзервы Беларусі ў лютым павялічыліся на 37,3 млн долараў (на 0,7%) да 5 млрд 22,3 млн долараў у эквіваленце.

У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў павялічыўся за люты на 214,2 млн долараў і на 1 сакавіка склаў 5 млрд 608,4 млн долараў у эквіваленце пасля росту ў студзені на 209,2 млн долараў. За студзень-люты рэзервы ў нацыянальным вызначэнні выраслі на 423,4 млн долараў, або на 8,2%.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Факт

НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ НАСТАЎНІК ГОДА ЖЫВЕ Ў СЛАЎГАРАДЗЕ

У Магілёве падвялі вынікі рэспубліканскага конкурсу прафмайстэрства педагагічных работнікаў.

Першапачаткова на трэці этап конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь» у Магілёўскай вобласці было пададзена каля 200 заявак, але пасля да вочнага, завяршальнага, тура дайшлі толькі 43 прэтэндэнты. Яны вытрымалі прадметнае псіхолага-педагагічнае тэсціраванне, праводзілі адкрытыя ўрокі ў незнаёмых класах, дзяліліся сваімі напрацоўкамі, давалі майстар-класы для студэнтаў МДУ імя А.А. Куляшова. У выніку журы назвала імёны 8 лепшых па прафесіі ў розных намінацыях. Але настаўнік працоўнага навучання СШ №1 горада Слаўгарада Эдуард Гардзееў пакарыў усіх сваёй любоўю да прафесіі і надзвычай творчым падыходам.

— Гэта сучасны вобраз настаўніка працы, — заўважыла **начальнік Магілёўскага цэнтра развіцця рэгіянальнай адукацыі Святлана СЕЛЯЗНЁВА.** — Ён робіць тое, чым пакуль ніхто не займаецца ў Беларусі. Хоць гэты прадмет адзін з найважнейшых для школьнікаў. У яго ёсць блог на Youtube, куды ён выкладвае для кожнага свайго ўрока відэаролікі. Гэта сапраўдныя майстар-класы, дзе ўжываецца выключна аўтарскі падыход. Любоў да прафесіі ў Эдуарда Гардзеева патомная, ён з сям'і педагогаў, яго брат таксама настаўнік. Да таго ж ён усебакова развіты чалавек: піша вершы, музыку, іграе на гітары і прыцягвае хлопцаў сваёй харызмай.

Кожны з пераможцаў атрымаў дыпломы і каштоўныя падарункі. Наперадзе іх чакае 4-ы этап рэспубліканскага конкурсу, які пройдзе ў верасні ў Мінску.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Філатэліст

МІНСК — «УЧОРА» І СЁННЯ

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпусціла ў абарачэнне паштовы блок «950 гадоў з часу першага пісьмовага ўпамінання Мінска» і дзве паштовыя маркі з серыі «Мінскі метрапалітэн».

На марках — мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу «Бітва на рацэ Нямізе», а таксама станцыі метро «Маскоўская» і «Пятроўшчына». Праекты падрыхтаваны па матэрыялах Інстытута гісторыі НАН Беларусі і ў супрацоўніцтве з дзяржаўным прадпрыемствам «Мінскі метрапалітэн»

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

15 сакавіка 2017 г.
№ 8 (392)

стар. 3

Маеш уласную гаспадарку — май юрыдычны дазвол

стар. 6

Цэнім ваду, калі высыхае калодзеж...

стар. 7

Без паперы няма веры?

ТЭМА ДНЯ

ЗНАЙСЦІ СЯБЕ... І ПРАЦУ

Як мясцовыя ўлады вырашаюць праблему занятасці

Фота Надзеі БУЖАН.

У Калінкавічах штодня становяцца на ўлік 5—6 беспрацоўных.

Чым у лес далей — тым гусцей. Прыказка, што трапна характарызуе сітуацыю на рынку працы. Чым меншы населены пункт, тым больш праблем з працаўладкаваннем, тым складаней знайсці работу. І калі ў мегаполісе ў беспрацоўных ёсць прастора для самастойнага пошуку вакансій, то ў невялікім райцэнтры людзям застаецца спадзявацца толькі на дзяржаўныя службы занятасці. Што перашкаджае жыхарам невялікага горада атрымаць работу? Чаму звальненне — гэта не прыгавор? Якія практычныя парады можна даць беспрацоўным? Адказы на вострыя пытанні, узнятыя ў тым ліку і на нарадзе ў Прэзідэнта, мы шукалі разам са спецыялістамі ўпраўлення працы, занятасці і сацыяльнай абароны Калінкавіцкага райвыканкама.

БЕЗ НАВУКІ ЯК БЯЗРУКІ

Невялікі горад, дзе ўся мясцовая эканоміка трымаецца на некалькіх прадпрыемствах. І калі ў іх пачынаюцца праблемы, гэта адбіваецца на ўзроўні жыцця ўсяго насельніцтва. Пад такое апісанне падпадае ці не большасць беларускіх райцэнтраў. І беспрацоўе па іх б'е найбольш балюча. Бо куды можа пайсці чалавек, які дагэтуль быў заняты, напрыклад, на вытворчасці? У сферу паслуг? Але ж у маленькіх гарадах гэты рынак даволі вузкі. У прыватны бізнес? А дзе ўзяць пачатковы капітал? Дый асноўныя нішы даўно занятыя. Застаецца або шукаць шчасця па-за межамі роднага горада, або спадзявацца на дзяржаўныя службы занятасці. Але ці здольныя яны даць рады цяпер, калі эканоміка перажывае не самыя лепшыя часіны?

стар. 5

МЫ ГЭТА МОЖАМ!

Парадаваць саміх сябе

Камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея» стаў прыкладам для іншых гараджан

«Надзея» дзейнічае ў Баранавічах больш за дзесяць гадоў. Камітэт стварыла група энтузіястаў ва ўсходнім мікрараёне горада. Сёння суб'ект самакіравання аб'ядноўвае 25 дамоў, у якіх пражывае каля 5 тысяч чалавек. Структура мае статус юрыдычнай асобы і, адпаведна, свой рахунак у банку, на які паступаюць грошы, сабраныя жыльцамі, і іншыя сродкі. У мінулыя гады «Надзея» атрымала некалькі грантаў ад міжнародных арганізацый. За час існавання камітэта знешні выгляд дамоў, пад'ездаў, двароў, якія ўваходзяць у суполку, істотна памяняўся. І самае галоўнае, досвед «Надзеі» стаў прыкладам для іншых.

Дружныя жыльцы

Апошнім часам у Баранавічах створаны яшчэ тры падобныя камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КТГС): «Сонечны», «Вясёлкавы», «Дамавічкі». І калі «Надзея» ахапіла фактычна цэлы мікрараён, то іншыя КТГС нашмат меншыя — аб'ядноўваюць дзе два, дзе тры дамы, але іх справы не менш каштоўныя. Больш таго, ёсць прыклады, калі ініцыятыўныя жыльцы не афармлялі арганізацыйна свой орган дамавога самакіравання, але здолелі так паставіць справу, што поспехаў дабіліся несумненных. Здараецца, іх узнагароджваюць рознымі дыпломамі ды каштоўнымі падарункамі. І вывучаюць іх вопыт. Такімі рупліўцамі можна назваць жыльцоў дома №2 па вуліцы Чыгуначнай.

На першы погляд ніколі не скажаш, што названаму дому 103 гады і ён памятае больш за палову гісторыі горада Баранавічы. Цэлае стагоддзе таму дом узвяло чыгуначнае ведамства для сваіх работнікаў. Як расказвалі бацькі Надзеі Сяргееўны Жытко, перад вайной некаторы час дом служыў казармай. А пасля вайны яны і іх равеснікі атрымлівалі тут кватэры. Цяпер тут жывуць іх дзеці-пенсіянеры і ўнукі, якія працуюць у самых розных галінах народнай гаспадаркі. І несумненны іх лідар — Надзея Жытко, у якой ёсць памочніца Лілія Златадрэва.

стар. 8

103-гадовы дом па вуліцы Чыгуначнай.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

ГІСТАРЫЧНАЯ СУСТРЭЧА

У маі Мінск прыме Камітэт міжпарламенцкага супрацоўніцтва ЦЕІ

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ сустрэўся з намеснікам генеральнага сакратара Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы Эрыкам ЧАРНОВІЦАМ.

Сустрэча была прысвечана пытанням узаемадзеяння ў парламенцкім вымярэнні Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы ў рамках старшынства Рэспублікі Беларусь у гэтай арганізацыі ў 2017 годзе. Спікер верхняй палаты беларускага парламента адзначыў, што для нашай краіны старшынства ў ЦЕІ мае асаблівае значэнне і яго па праву можна назваць гістарычнай для краіны падзеяй.

Асаблівая ўвага была ўдзелена падрыхтоўцы пасяджэння Камітэта міжпарламенцкага супрацоўніцтва парламенцкага вымярэння Ініцыятывы, якое пройдзе ў Мінску ў маі гэтага года. Акрамя таго, бакі абмеркавалі перспектыўныя праекты, якія могуць быць рэалізаваны ў ходзе беларускага старшынства ў ЦЕІ.

АД РЭГІЁНАЎ — ДА ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ

Адбылася нарада са старшынямі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў

У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА адбылася нарада са старшынямі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў.

У яе ходзе абмеркаваны пытанні, якія датычацца падрыхтоўкі чацвёртага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі на тэму «Вектары інтэграцыйнага развіцця рэгіёнаў Расіі і Беларусі ў сферы высокіх тэхналогій, інавацый і інфармацыйнага грамадства» ў частцы арганізацыі работы секцыі на тэму «Ад рэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі да супрацоўніцтва гарадоў і раёнаў: новыя магчымасці і перспектывы». Таксама ўдзельнікі мерапрыемства абмеркавалі асобныя аспекты дзейнасці Саветаў дэпутатаў пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню і правядзенне ў Рэспубліцы Беларусь у 2017 годзе сумесна з Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы мерапрыемства па актуальных пытаннях мясцовага самакіравання.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

МЫ МОЖАМ І БОЛЬШ

Намеснік старшыні германска-беларускай парламенцкай групы бундэстага наведаў Мінск

Раней зносіны паміж дзвюма краінамі адбываліся, у асноўным, праз спецыяльных дакладчыкаў і праз сувязі ў міжнародных арганізацыях, цяпер — ідзе прамы дыялог. «Мы не адмаўляемся ад кантактаў з гэтымі міжнароднымі арганізацыямі, але я лічу, што дыялог напрамую больш эфектыўны», — адзначыў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.

Ёхан ВАДЭФУЛЬ, намеснік старшыні германска-беларускай парламенцкай групы бундэстага, сустрэўся з прадстаўнікамі абедзвюх палат беларускага парламента і **з міністрам замежных спраў Уладзімірам МАКЕЕМ.** Спадар Вадэфуль падкрэсліў, што ёсць зацікаўленасць у больш цесных адносінах паміж Беларуссю і Германіяй. Да гэтага былі зроблены добрыя крокі. «Мы лічым, што Беларусь з'яўляецца часткай еўрапейскай супольнасці каштоўнасцяў, і я вельмі быў рады пачуць, што ўсе падзяляюць маё меркаванне. Мы хочам дамагчыся інтэнсіфікацыі нашых адносін. Каб нямецкія інвестары прыходзілі ў Беларусь, трэба, каб тут былі адпаведныя ўмовы ў галіне прававой бяспекі. А для гэтага неабходныя рэформы, — адзначае Ёхан Вадэфуль. — Усё гэта — эвалюцыйны працэс, які павінен адбывацца крок за крокам».

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Беларусі ПІРШТУК расказаў, што Германія з'яўляецца нашым буйным партнёрам на еўрапейскім напрамку і займае асаблівае становішча ў знешняй палітыцы. «Апошнім часам актывізаваліся кантакты нашай краіны з дзяржавамі Еўропы. І сённяшняя сустрэча гэта пацвярджае», — заўважыў ён. Віцэ-спікер адзначыў вялікую ролю парламентарыяў у гэтым працэсе: «Мы можам рабіць больш, каб адносіны былі дынамічнымі і эфектыўнымі».

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

ЕЎРОПА ВЫВУЧЫЦЬ НАШ ВОПЫТ

У сталіцы ў маі рыхтуецца канферэнцыя па лініі Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы

Фота БЕЛТА.

Пра гэта расказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Аляксандр ПАПКОЎ. На канферэнцыю, акрамя замежных гасцей, плануюць запрасіць навукоўцаў і прадстаўнікоў недзяржаўных арганізацый, каб разгледзець актуальныя праблемы на месцах.

Таксама ў Мінску гэтай вясной плануюць правесці пасяджэнне Бюро Канферэнцыі мясцовых і рэгіянальных улад Усходняга партнёрства, у якой інтарэсы Беларусі Аляксандр Папкоў прадстаўляе разам са старшынёй Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Васілём Панасюком і старшынёй Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімірам Цярэнцьевым. Сярод пытанняў, якія будуць абмяркоўвацца падчас сустрэчы, — ўкараненне энергаэфектыўных тэхналогій і развіццё тэрыторый, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Дарэчы, да кастрычніка гэтага года Беларусь з'яўляецца сустаршынёй у гэтай Канферэнцыі.

Па словах Аляксандра Папкова, у нас ёсць усе элементы мясцовага кіравання і самакіравання, уласцівыя Еўропе. Мы таксама вывучаем еўрапейскі вопыт, напрыклад, па стварэнні новых працоўных месцаў і арганізацыі турызму.

Цяпер адна з праблем, з якой сутыкаецца эканоміка на мясцовым узроўні, — фарміраванне такога ВУП, якога хапала б на вырашэнне ўсіх пытанняў. «Мы павінны думаць, якім чынам павышаць заработныя платы, пенсійнае забеспячэнне, ствараць новыя працоўныя месцы, паляпшаць сацыяльнае асяроддзе ў тым ці іншым рэгіёне. Але гэта мы можам зрабіць толькі тады, калі скаардынуем нашы намаганні».

Дарэчы, тэмай наступнага пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі стане ўцягненне ў гаспадарчы абарот камунальнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца ці выкарыстоўваецца неэфектыўна. Як гэта працуе, разгледзяць на прыкладзе Мінскага і, магчыма, Дзяржынскага раёнаў.

Адной з тэм для абмеркавання стане пытанне, у якой меры сучаснае заканадаўства спрыяе развіццю прадпрымальніцкай ініцыятывы ў раёнах. «Мы праводзім гэтую работу, каб вывучыць, наколькі сёння дастаткова нарматыўных дакументаў. Мы можам дапрацоўваць нашу заканадаўчую аснову для вырашэння пэўных пытанняў, каб ствараць умовы для малога, сярэдняга і буйнога бізнесу», — сказаў Аляксандр Папкоў.

Іншая праблема мясцовых Саветаў — недахоп матэрыяльных сродкаў. «Гэта насамрэч так. Бюджэтныя сродкі загадзя запланаваны на рашэнне пэўных задач, у тым ліку на выплату заработнай платы. А ёсць пытанні, якія трэба вырашаць кожны дзень. На жаль, сёння дзяржава не можа адкрыць усе «куфэркі». Мы будзем разглядаць летам на прыкладзе Магілёўскай вобласці, якім чынам нам зарабляць грошы на месцах, якія ствараць для гэтага ўмовы».

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

ЯК БУДЗЕ МЯНЯЦЦА СТАЛІЦА

Аб чым гаварылі на сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў

На дваццаць першай чарговай сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў закранулі цэлы спектр тэм: ад колькасці уведзеных за 2016 год спартыўных аб'ектаў да памеру бюджэту сталіцы. Усяго дэпутатамі было разгледжана 22 пытанні, якія вызначаць ход развіцця Мінска на наступныя гады. Мы выбралі найбольш цікавыя моманты.

Паліклінікі і дарогі

Старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый гарвыканкама Дзмітрый ГУРЫНЕНКА адзначыў, што ў 2017-м дадатковыя сродкі пры зацвярджаным пераразмеркаванні фінансавання пойдуць на рамонт і пракладку дарожнага палатна, а таксама ўзвядзенне сацыяльных аб'ектаў.

Паміж гандлёвым цэнтрам «Замак» і Нацыянальным выставачным цэнтрам «БелЭкспа» пабудуюць падземны пераход — на гэта выдзелена больш за два мільёны рублёў. Частка сродкаў пойдзе на пракладку інжынерных сетак па вуліцы Дражня і ўзвядзенне дажджавых калектараў. Згодна з зацверджаным планам буйную суму накіруюць на стварэнне дзіцячай паліклінікі ў мікрараёне Дружба, а таксама на распрацоўку плана дзіцячай паліклінікі ў мікрараёне Лошыца-9. Таксама значныя сумы выдзелены на развіццё спартыўнай інфраструктуры: каля мільёна рублёў пойдзе на будаўніцтва сеткі веладарожак.

Сталічныя інвестыцыі

38,1 мільярда долараў замежных інвестыцый плануецца прыцягнуць у эканоміку Мінска да 2020 года, адзначыў **старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама Мікалай РАГАШЧУК** падчас прадстаўлення Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця горада Мінска на 2016—2020 гады.

«У 2016 годзе Мінск увайшоў у рэйтынг самых перспектыўных для інвестыцый еўрапейскіх гарадоў, — адзначыў Мікалай Рагашчук. — Будзе працягвацца рэалізацыя 20 інвестпраектаў з удзелам замежнага капіталу». Акрамя таго, сёння разглядаюцца магчымыя варыянты супрацоўніцтва з рознымі замежнымі кампаніямі. Прыярытэтным напрамкам з'яўляецца прыцягненне інвестыцый з Кітая. «Мы чакаем не менш за 100 мільёнаў долараў на год», — падкрэсліў Мікалай Рагашчук.

У знешнеэканамічнай дзейнасці працягнецца актыўная работа па развіцці рынкаў збыту — для дасягнення раўнамернага размеркавання экспартных паставак паміж ЕАЭС, ЕС і краінамі далёкага замежжа. Гэта дазволіць асвоіць новыя рынкі і замацавацца на іх, а таксама скараціць магчымую залежнасць эканамічнага росту горада ад аднаго гульца.

Новае жыллё

За перыяд з 2016 па 2020 год перад будаўнічым комплексам Мінска пастаўлена задача па ўводзе ў эксплуатацыю новага жылля, а таксама па забеспячэнні будаўніцтва аб'ектаў культурна-бытавога і вытворчага прызначэння. Аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва будуць скарачацца. Аднак працягнецца засваенне тэрыторый каля Нацыянальнай бібліятэкі, аэрапорта Мінск-1, у мікрараёне Лошыца. За 5 гадоў у Мінску плануецца ўвесці ў эксплуатацыю не менш за 3,4 мільёна квадратных метраў жылля.

Увага прадпрымальніцтву

Асаблівая ўвага ў наступныя гады будзе ўдзяляцца фарміраванню спрыяльнага прадпрымальніцкага асяроддзя, падтрымцы і развіццю прыватнага бізнесу. Дзякуючы гэтаму плануецца забяспечыць рост удзельнай вагі суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Развіццё прыватнага сектара павінна паспрыяць стабілізацыі сітуацыі на рынку працы. Са з'яўленнем новых прадпрыемстваў плануецца штогадовае працаўладкаванне не менш чым 30 тысяч чалавек. Згодна з планам узровень беспрацоўя не перавысіць 0,8% эканамічна актыўнага насельніцтва сталіцы.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ. *lukashevich@zviazda.by*

Фота БЕЛТА.

Рэканструкцыя набярэжнай Свіслачы.

ПАСЛЯ НАРАДЫ Ў ПРЭЗІДЭНТА

Заданне на найбліжэйшы час

Пытанняў да выканання гэтага заканадаўчага акта назбіралася шмат. Дэкрэт №3 абмяркоўваюць як дома, у сямейным коле, так і ва ўладных структурах. Асабліва пасля таго, як тэму правапрымянення дакумента закрануў днямі Прэзідэнт. Мы высветлілі, што прапаноўваюць тыя, хто непасрэдна працуе з людзьмі і асабіста ведае сітуацыю на месцах.

Намеснік старшыні Камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Людміла КАНАНОВІЧ:

— Праводзячы работу ў выбарчых акругах, мы сустракаліся са сваімі выбаршчыкамі і бачылі, што на пачатковай стадыі ўзнікалі пэўныя праблемы. Вельмі шмат было разаслана апавяшчэнняў тым, хто не павінен быў трапіць у спіс плацельшчыкаў. Сёння прынята рашэнне, каб усе зацікаўленыя паўдзельнічалі ў фарміраванні гэтай базы даных. Я думаю, што за пэўны перыяд яна будзе сфарміравана карэктна. Мясцовыя Саветы дэпутатаў у першую чаргу павінны быць праваднікамі Дэкрэта №3. Тлумачэнне на месцах, якое мы трохі ўпусцілі, трэба нагнаць, трэба расказваць усім, даводзіць і актуальнасць дадзенага дэкрэта, і тыя задачы, якія стаяць. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што дэкрэт мае ў першую чаргу маральны, ідэалагічны аспект. Жыццёвых сітуацый сапраўды вельмі шмат, і мы павінны былі падыходзіць да кожнага чалавека індывідуальна, разглядаць кожны выпадак у залежнасці ад таго, хто ў якім рэгіёне жыве. Чалавек павінен быць пастаўлены ў аснову ўсіх нашых рашэнняў.

Старшыня Бешанковіцкага раённага Савета дэпутатаў Генадзь ШВЕДАЎ:

— Неабходна больш старанна вывераць спісы людзей, якія трапілі пад дзеянне Дэкрэта №3. Гэта мы бачым як заданне для сябе. Старшыням сельвыканкамаў ужо дадзены адпаведныя распараджэнні. Вядома, ёсць людзі з цяжкай жыццёвай сітуацыяй. Мы зыходзім з таго, каб даць ім палёгку. Яшчэ адзін момант — праверка спісаў, гэта дасць імпульс для працаўладкавання. Мы больш канкрэтна папрацуем з тымі людзьмі, якіх, можа быць, да гэтага не заўважалі. Ужо многія сталі на біржу працы. І мы робім усё магчымае, каб дапамагчы ім з пошукам.

Старшыня Любашаўскага сельскага Савета дэпутатаў Ганцавіцкага раёна Уладзімір ГАРДЗЕЙ:

— Калі захочаш, працаваць будзеш. А калі не... Ёсць, вядома, розныя катэгорыі людзей. У нас у раёне мала прадпрыемстваў, ідзе аптымізацыя, бывае, што цяжка знайсці працу. Былі і тыя, каго мы вызвалялі ад выплаты ў сувязі з цяжкімі жыццёвымі сітуацыямі. Але і, напрыклад, былі два хлопцы, якія жылі за кошт мамінай пенсіі... У нас тут яшчэ лясы добрыя — можна хадзіць, нешта збіраць. Увогуле трэба рабіць упор на індывідуальнае прадпрымальніцтва, малы бізнес. У нас ёсць гаспадаркі з трыма-чатырма каровамі, яны бяруць для сябе зямлю. Яна іх і корміць.

Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Алег БАРЫСЕНКА:

— Зараз ужо падрыхтаваны прапановы наконт таго, як удасканаліць працу па Дэкрэце №3. Неабходна ўлічыць памылкі, якія былі дапушчаны. Дэпутаты ўсіх узроўняў працуюць з грамадзянамі і тлумачаць ім, куды яны могуць звярнуцца ў выпадках, калі склалася цяжкая жыццёвая сітуацыя. Але патрэбна і дадатковае інфармаванне. Перш за ўсё — праз тэлебачанне. Наша, мясцовае, займаецца гэтым, але было б больш эфектыўна, калі б пэўныя пытанні разглядаліся на ўзроўні рэспубліканскіх тэлеканалаў. Былі таксама выпадкі, калі ў базу траплялі тыя, каго гэты дэкрэт не павінен датычыцца. Напрыклад, студэнты, якія ў 2015 годзе скончылі ВНУ і не змаглі знайсці працу... Або ўзяць, напрыклад, сельскую гаспадарку. У чым розніца — вырошчваць агародніну на зямлі, выдзеленай пад уласную падсобную гаспадарку ці пад абслугоўванне будынка? Некаторыя з гэтых прапаноў, магчыма, будуць прыняты.

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

ТРЭБА ВЕДАЦЬ

КАЛІ ПРАЦУЕШ НА ЗЯМЛІ

Маеш уласную гаспадарку — май юрыдычны дазвол на карыстанне ёй

Чалавек, які зарэгістраваны на вёсцы і займаецца ўласнай гаспадаркай, лічыцца асобай, што ўдзельнічае ў фінансаванні дзяржаўных расходаў, таму ў тэорыі ўтрыманцам быць не можа. На практыцы ж высветлілася, што нават калі ты трымаеш карову, парася ды курыцу, даглядаеш сад і садзіш грады, аднак пры гэтым не маеш тэхнічнага пашпарта на дом ці акта землекарыстання для вядзення ўласнай гаспадаркі, то ты — утрыманец.

Хай «сотка», але са статусам

Пры гэтым нідзе ў законе не прапісана, якой колькасцю зямлі трэба валодаць, каб пазбегнуць праблем з дадатковымі выплатамі. Гэта можа быць нават адна сотка, аднак яна павінна мець статус: «для вядзення ўласнай падсобнай гаспадаркі». Умоўна кажучы, у акце на зямлю ў 25 сотак павінна быць указана, што 10 з іх адведзена, скажам, пад абслугоўванне дома на ўчастку, а 15 — на ўласную падсобную гаспадарку.

— Каб не апынуцца ў становішчы ўтрыманца і надалей, тым, хто працуе на зямлі, жыццёва неабходна аформіць акт землекарыстання, — упэўнены **Віктар РОІК, старшыня Воранаўскага раённага Савета дэпутатаў.** — Гэта памылка людзей, што яны не падрыхтаваліся да сітуацыі, калі Дэкрэт №3 толькі прымаўся. Немец адразу прымярае на сябе кожны новы закон, думае, як гэта на ім адаб'ецца, і прымае меры. А наш чалавек чакае, пакуль надыдзе 2017 год, а атрымаўшы ліст з падатковай, пачынае думаць... Цяпер надышоў час меркаваць, як у 2018 годзе пазбегнуць неабходнасці плаціць падатак за сёлетняе нежаданне афармляць дакументы на зямлю.

Дарэчы, афіцыйна аформіць паперы на зямлю карысна яшчэ і таму, што не будзе павінен плаціць збор на фінансаванне дзяржаўных расходаў не толькі ўладальнік участка, а і ўсе члены яго сям'і, што там зарэгістраваныя. Гэта датычыцца мужа, жонкі, дзяцей, бацькоў абодвух сужэнцаў.

Па законах юрыдычных і чалавечых

Разглядам юрыдычных асаблівасцяў сітуацый і ўнікненнем у акалічнасці цяжкага жыццёвага становішча людзей на вёсцы займаецца спецыяльная камісія. У яе ўваходзяць члены раённага выканаўчага камітэта на чале са старшынёй, старшыня раённага Савета дэпутатаў, старшыні сельскіх Саветаў, кіраўнікі галін жыллёва-камунальнай гаспадаркі, сацыяльнай абароны насельніцтва, аховы здароўя, старшыня камісіі па мандатах і законнасці — усе, да каго ў чалавека могуць быць пытанні ці хто будзе валодаць інфармацыяй пра асобу, якую залічылі ў шэрагі ўтрыманцаў.

— У нас каля 40 чалавек звярнуліся ў райвыканкам па вызваленне ад падатку на ўтрыманства, бо яны лічаць, што трапілі ў цяжкае жыццёвае становішча. Некалькі чалавек сапраўды апынуліся ў такой сітуацыі. Напрыклад, хворыя, што не могуць працаўладкавацца. Аднак прыходзяць жа і здаровыя, якія могуць працаваць. Я адразу пытаюся ў іх, якую спецыяльнасць яны маюць. У многіх ніякай няма. Дзе сёння можна ўладкавацца без спецыяльнасці? Дык давайце вучыцца, — заклікае **Мікалай РОЗУМ, старшыня Воранаўскага райвыканкама.** — Калі вы хочаце працаваць на прамысловым прадпрыемстве, вам трэба ехаць у Ліду. А калі хочаце ў нашым раёне, то акрамя як у бюджэтнай сферы і ў сельскай гаспадарцы, працы вы больш нідзе не знойдзеце. Мы стараемся вызваляць бюджэтныя месцы для маладых, калі папярэднікам прыходзіць час ісці на пенсію. А вось сельская гаспадарка часта пакутуе ад таго, што мы ўсіх трымаем на працы, бо іх няма кім замяніць, ніхто не хоча туды ісці.

Старшыня Савета дэпутатаў мяркуе, што ў некаторых выпадках самі бацькі робяць мядзведжую паслугу сваім дзецям, бо ўсё жыццё песцяць іх і даглядаюць. А цяпер, калі яны без афіцыйнага працаўладкавання, маці бегаюць і думаюць, як пазбегнуць выплаты грошай.

— Кожную сітуацыю мы разбіраем індывідуальна. Шэсць чалавек у раёне вызвалілі ад падатку поўнасцю, шаснаццаць — часткова. За кожнага чалавека доўга спрачаемся, вырашаем, бо ёсць законы юрыдычныя, а ёсць і людскія. Людзям, якія беспадстаўна скардзяцца на атрыманыя «лісты шчасця», расказваю пра падаткі на ўласным прыкладзе. Я падлічыў, якая частка маёй зарплаты штомесяц ідзе на падаткі. Калі гэтую лічбу перавесці ў час, атрымаецца, што 31—32 дні на год я працую на выкананне канстытуцыйнага абавязку грамадзяніна па ўдзеле ў фінансаванні дзяржаўных расходаў. За 35 гадоў працы я такім чынам каля 52 месяцаў (а гэта больш за чатыры гады!) адпрацаваў на падаткі... Некаторыя адразу змаўкаюць, калі такія лічбы чуюць.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

СЕСІЯ

Размаўляць з людзьмі

На сесіі Брэсцкага абласнога Савета яго дэпутаты падвялі вынікі работы за мінулы год і абмеркавалі стан спраў на падведамаснай тэрыторыі.

Старшыня аблсавета Сяргей Ашмянцаў агучыў колькасць зваротаў грамадзян у адрас абласнога прадстаўнічага органа. Іх у справаздачным перыядзе было больш за 180. Сам старшыня Савета правёў за год чатыры прамыя лініі. Каля паўтары сотні тэлефонных званкоў з месцаў разглядаліся аператыўна. На большую частку зваротаў дадзены тлумачэнні, некаторыя просьбы і скаргі ўзятыя на кантроль.

У дакладзе на сесіі асаблівая ўвага ўдзялялася рабоце мясцовых Саветаў дэпутатаў па падтрымцы асабістых падсобных гаспадарак грамадзян. Напрыклад, на прыём да старшыні аблсавета летась прыйшла жанчына з Жабінкаўскага раёна з просьбай дапамагчы набыць ёй дзве тоны саломы. Вядома, гэтую праблему павінны былі вырашыць на раённым, а то і на пярвічным узроўні.

Дэпутаты зноў засяродзілі ўвагу на паляпшэнні якасці тлумачальнай, інфармацыйнай работы. Кіраўнік абласнога Савета лічыць, што народныя выбраннікі на месцах нярэдка ўпускаюць такі важны аспект работы з насельніцтвам, як прапаганда здаровага ладу жыцця і клопат пра ўласную бяспеку.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

Выдаткаў менш, хуткасці больш

Беларуская чыгунка завяршыла рэканструкцыю ўстройстваў кантактнай сеткі на перагоне Маладзечна—Уша.

У рамках электрыфікацыі ўчастка Маладзечна—Гудагай—дзяржграніца магістраль правяла рэканструкцыю існуючых устройстваў кантактнай сеткі на перагоне Маладзечна—Уша. Гэта 4,5 кіламетра двухпутнага ўчастка чыгункі.

У сціслыя тэрміны была выканана работа па суцэльнай замене апор, якія падтрымліваюць канструкцыі, і кантактнай падвескі па 1-м і 2-м чыгуначных пуцях адпаведна. Работы былі арганізаваныя ва ўмовах пастаяннага руху цягнікоў па суседнім пуці, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

«Сакрэт канкурэнтаздольнасці — у сумесным развіцці навуковай сферы»

Як ідзе падрыхтоўка да чацвёртага Форуму рэгіёнаў?

У гэтым годзе, як і ў мінулыя тры, мусіць адбыцца падзея, якая абяцае беларускім прадпрыемствам мільённыя кантракты, новыя рынкі збыту і ажыўленне ўжо даўно напрацаваных. Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі традыцыйна становіцца багатым на наладжванне сувязяў для абодвух бакоў. Спецыяльна для «МС» пра галоўную тэму будучага форуму — інавацыі — расказаў старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН.

— Галоўныя тэмы Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў гэтым годзе — высокія тэхналогіі і інавацыі. Якім чынам узаемадзеянне на рэгіянальным узроўні можа вывесці гэтыя сферы на новы для нашай краіны ўзровень?

— Узаемадзеянне рэгіёнаў Беларусі і Расіі ўносіць значны ўклад у развіццё эканамічных сувязяў. Гэта ўмацоўвае як двухбаковыя адносіны нашых краін, так і працэс будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Менавіта таму неабходна нарошчваць паслядоўныя намаганні па паравядзенні нацыянальных эканомік на інавацыйны шлях развіцця, стварэнні высокаэфектыўных і высокатэхналагічных вытворчасцяў, пашырэнні вытворчай кааперацыі.

Найважнейшая тэндэнцыя апошняга часу — нарастанне інтэграцыйных працэсаў Беларусі і Расіі ў навукова-тэхнічнай сферы на рэгіянальным узроўні. Навука становіцца глабальным фактарам грамадскага развіцця. Супрацоўніцтва ў навукова-тэхнічнай сферы служыць найважнейшым складнікам эфектыўнага ўзаемадзеяння абедзвюх дзяржаў. Яно заключаецца ў пашырэнні кааперацыі і інтэграцыі ў галіне сумесных даследаванняў і распрацовак праз праграмы Саюзнай дзяржавы.

Нягледзячы на тое, што ўзаемадзеянне дзвюх дзяржаў выйшла на новы ўзровень стратэгічнага партнёрства, сёння мы яшчэ не можам гаварыць аб цэласнай сістэме навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, навукова-тэхнічнай дзейнасці рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Гэта асабліва важна з улікам узмацнення канкурэнцыі на сусветным рынку. У гэтых умовах залогам паспяховага пераадолення цяжкасцяў павінна стаць супрацоўніцтва па выпуску высокатэхналагічнай навукаёмістай прадукцыі, заснаванай на новых ведах, інавацыях, удасканаленых тэхналогіях, якія будуць укараняцца ў серыйную вытворчасць у Беларусі і Расіі.

Пры гэтым фарміраванне і правядзенне адзінай навукова-тэхнічнай, прамысловай, энергетычнай, транспартна-лагістычнай і гандлёвай палітыкі нашых краін будзе ў значнай ступені стымуляваць вытворчасць такой прадукцыі і спрыяць павышэнню яе экспартнага патэнцыялу, уключэнню ў гэты працэс зацікаўленых прадстаўнікоў дзелавых колаў дзвюх краін.

— Чым беларускія навукоўцы могуць зацікавіць расійскіх? У якіх сферах нашы даследчыкі асабліва моцныя? І наадварот, як расійскія вучоныя ўплываюць на развіццё беларускай навукі ў рамках форуму?

— Сярод прыярытэтаў у галіне навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва беларускіх і расійскіх вучоных — даследаванне космасу, энергетыка, харчаванне, новыя матэрыялы і тэхналогіі.

У касмічнай галіне ўжо выканана пяць саюзных праграм, цяпер распрацоўваюцца яшчэ дзве. Дзякуючы супрацоўніцтву з расійскімі калегамі, беларускім спецыялістам удалося стварыць касмічную групоўку спадарожнікаў. Цяпер ажыццяўляецца работа над яшчэ адным апаратам дыстанцыйнага зандзіравання. Кіраванне і прыём інфармацыі ў спадарожнікаў узаемазаменныя: у выпадках збою ў рабоце аднаго з апаратаў беларусы змогуць кіраваць імі, і наадварот. Па сутнасці, для Беларусі гэта развіццё новай галіны — касмічных тэхналогій.

> Найважнейшая тэндэнцыя апошняга часу — нарастанне інтэграцыйных працэсаў Беларусі і Расіі ў навукова-тэхнічнай сферы на рэгіянальным узроўні.

Іншым важным напрамкам супрацоўніцтва з'яўляюцца саюзныя праграмы ў галіне інфармацыйных тэхналогій. Сумесна з расійскімі калегамі распрацавана сістэма суперкамп'ютараў «Скіф» і звязаных з імі праграмна-інфармацыйных сродкаў. На базе сямейства суперкамп'ютараў створаны цэнтр калектыўнага карыстання ў Аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі і Аб'яднаным інстытуце энергетычных і ядзерных даследаванняў НАН Беларусі. Актыўна развіваецца кірунак па стварэнні праблемна арыентаваных інфармацыйна-касмічных распрацовак і іх укараненні ў практыку. Так, у праграме «СКІФ-Нетры» распрацоўваюцца спецыялізаваныя апаратна-праграмныя сродкі для пошуку і выкарыстання карысных выкапняў.

У ліку ўзаемавыгадных кірункаў супрацоўніцтва вучоных Беларусі і Расіі можна назваць праграмы ў галіне электронікі, звышвысокачастотных выпраменьванняў і святлодыёднай тэхнікі і прыбораў на іх аснове. У гэтых кірунках беларускія спецыялісты плённа супрацоўнічаюць з Санкт-Пецярбургскім навуковым цэнтрам РАН, Фізіка-тэхнічным інстытутам імя А.Ф. Іофе, інавацыйным цэнтрам «Сколкава».

Існуе шырокі спектр пытанняў, якія ўяўляюць узаемную цікавасць у галіне медыцыны. Гэта тэматыка ствалавых клетак, тэхналогіі іх выкарыстання, новыя лекі, тэхніка і новыя матэрыялы для медыцыны. Яшчэ адзін з перспектыўных і паспяховых напрамкаў супрацоўніцтва беларускіх вучоных з навукоўцамі Новасібірскай вобласці звязаны са стварэннем новых матэрыялаў як для машынабудавання, так і для хімічнай прамысловасці. Развіваецца супрацоўніцтва ў сферы біятэхналогій.

У Новасібірску ёсць прадпрыемства, якое цалкам працуе на беларускім абсталяванні вытворчасці «Планар». Гаворка ідзе пра сістэмы для мікралітаграфіі. Ёсць зацікаўленасць у сібірскіх навукоўцаў і ва ўдзеле ў распрацоўцы праектаў навукова-тэхнічных праграм Саюзнай дзяржавы. Асаблівая ўвага будзе звернута на распрацоўку новых лазерных і адытыўных тэхналогій, а таксама механічнай апрацоўкі ў машынабудаванні. Перспектыўнымі бачацца і даследаванні ў галіне прататыпавання матэрыялаў, элементаў і прылад нана-, оптаі біяэлектронікі.

Фота БЕЛТА.

Падчас трэцяга Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Мэр Масквы Сяргей САБЯНІН наведаў выстаўку «Белагра-2016».

У Інстытуце ядзернай фізікі новасібірскага Акадэмгарадка расійскія і беларускія навукоўцы працягваюць сумесную працу над кантраляваным тэрмаядзерным сінтэзам, што дасць магчымасць стварыць тэрмаядзерны рэактар. Ключавой перавагай гэтай распрацоўкі перад атамнай энергетыкай з'яўляецца бяспека такіх станцый.

— Па вопыце мінулага года, якая эфектыўнасць — па факце — ад сустрэч падчас Форуму рэгіёнаў?

— Эканамічны эфект — больш за 20 новых дакументаў, падпісаных у ходзе форуму, а таксама каля 150 камерцыйных кантрактаў на суму звыш 230 мільёнаў долараў ЗША.

— Што, на ваш погляд, варта ўдасканаліць у мерапрыемстве? Ці дастаткова той праграмы, якая была?

— Існуючы фармат мерапрыемства дазваляе абмеркаваць шырокае кола пытанняў двухбаковага ўзаемадзеяння, накіраванага на пашырэнне міжрэгіянальнага беларуска-расійскага супрацоўніцтва, вызначыць праблемы і шляхі іх вырашэння, а таксама перспектыўныя напрамкі далейшага супрацоўніцтва.

Ужо зацверджаны рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2017 годзе Года навукі, які з'яўляецца своеасаблівай «дарожнай картай» максімальнага ўключэння навуковай сферы ў забеспячэнне канкурэнтаздольнасці Беларусі на сусветным рынку і дзе асноўны акцэнт зроблены на арганізацыі інавацыйнай дзейнасці ў галіне навукі і на міжнародным супрацоўніцтве.

Так, на першым пасяджэнні беларускай і расійскай частак арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні чацвёртага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі мною было прапанавана ў рамках форуму правесці пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Дзень беларускай навукі. Яго цэнтральным мерапрыемствам будзе выстаўка навукова-тэхнічных і інавацыйных распрацовак. Яна мусіць стаць дыскусійнай пляцоўкай для абмену думкамі і вопытам беларускіх і расійскіх вучоных. У рамках выстаўкі будзе арганізаваны кірмаш патэнтаў (карысных вырабаў).

Плануецца, што Дзень беларускай навукі пройдзе напярэдадні форуму, 27—28 чэрвеня ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі. У рамках Дня навукі будуць праведзены круглыя сталы, адбудзецца наведванне прадпрыемстваў, навуковых арганізацый і ўстаноў, тэхнапаркаў, плануецца заключэнне пагадненняў, падпісанне камерцыйных кантрактаў паміж рэгіёнамі і суб'ектамі гаспадарання ў навукова-тэхнічнай і інавацыйнай сферах.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

У ТЭМУ

ГАЛОЎНЫ РАЗДЗЕЛ — ДЛЯ ІНАВАЦЫЙ

У Савеце Рэспублікі ўжо ідзе падрыхтоўка да чацвёртага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Пакуль вырашаюцца арганізацыйныя пытанні, размеркаваны сферы адказнасці.

Так, Пастаянная камісія па эканоміцы, бюджэце і фінансах адказвае за арганізацыю кірмашу-продажу, а таксама выстаўкі. Як паведаміў карэспандэнту «МС» **старшыня Пастаяннай камісіі Уладзімір ПАНЦЮХОЎ**, у праекце яе канцэпцыі ўжо вызначана каля дзясятка раздзелаў.

Паколькі асноўная тэма форуму — інавацыі, адзін з кластараў будзе прысвечаны навукова-тэхнічнаму і інавацыйнаму патэнцыялу. Сярод экспанентаў секцыі — амаль усе дзяржаўныя ўніверсітэты: тэхнічны, інфарматыкі і радыёэлектронікі, тэхналагічны, БДУ. Вядома, што да ўдзелу далучыцца і Акадэмія навук, яе Інстытут хіміі новых матэрыялаў, НПЦ па матэрыялазнаўстве, Фізіка-тэхнічны інстытут. Падчас экспазіцыі плануецца прадэманстраваць дасягненні ў сферы касмічных тэхналогій, электронікі і радыёэлектронікі, найноўшых тэхналогій і матэрыялаў, інжынерыі паверхняў, прыбораў і абсталявання.

У рамках аднаго кластара выстаўкі — «прамысловага» — прадэманстраваць свае дасягненні плануюць «Інтэграл», «Магілёўліфтмаш», «МАЗ», «Амкадор», «Мінскі трактарны завод» і яшчэ дзясятак айчынных прадпрыемстваў. Гэта будзе адзін з самых відовішчных раздзелаў, бо тут плануецца паказаць сумесныя беларуска-расійскія распрацоўкі ў станка- і машынабудаванні, электратэхнічнай прадукцыі, ліфтавым абсталяванні, стралковай і бранятанкавай зброі, а таксама ў аўтамабільнай, сельскагаспадарчай і дарожна-будаўнічай тэхніцы.

Астатнія раздзелы прысвечаны сферам аховы здароўя, фармацэўтыцы, хіміі і нафтахіміі, ваенна-прамысловаму комплексу, Парку высокіх тэхналогій, інавацыйным прадпрыемствам прыватнай формы ўласнасці, Беларускаму рэспубліканскаму саюзу моладзі.

ЗНАЙСЦІ СЯБЕ... І ПРАЦУ

Фота Надзеі БУЖАН.

Алена ЗМУШКА, начальнік аддзела занятасці і сацыяльна-працоўных адносін.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

На амаль 60 тысяч насельніцтва — 1306 «першасных» звароталі ад беспрацоўных у мясцовае ўпраўленне працы, занятасці і сацыяльнай абароны. Гэта лічбы па Калінкавіцкім раёне за мінулы год. Цікава, што сітуацыя павольна, але паляпшаецца. Бо яшчэ пазалетась па дапамогу ў пошуку работы звярталася 1435 гараджан і вяскоўцаў. «Мы перажылі напружанасць, — кажа **Алена Змушка, начальнік аддзела занятасці і сацыяльна-працоўных адносін**. — На 1 сакавіка 2016 года на 333 беспрацоўных, што стаялі на ўліку, мы мелі толькі 154 вакансіі. А сёлета ў пачатку сакавіка 269 беспрацоўным можам прапанаваць 263 вакансіі».

> “Сёння няма эканамічнай рацыі адначасова трымаць у штаце і электрыка, і сантэхніка. Прасцей узяць аднаго чалавека, які будзе ладзіць праводку, а пры патрэбе і кран памяняе.

На паперы лічбы выглядаюць прыгожа. Але ў рэчаіснасці не ўсё так проста. Бо амаль палова беспрацоўных не мае за плячыма ніякай адукацыі, акрамя школы. Ім застаецца некваліфікаваная фізічная праца. Нездарма бацькі часам пужаюць гультаяватых дзяцей: «Не будзеш вучыцца — пойдзеш у дворнікі!» Ды цяпер і ў дворнікі трапіць няпроста. Вакансіі грузчыка таксама днём з агнём не адшукаеш. Схема «папрацаваў — напіўся — выгналі — узялі новага» цяпер не актуальная — людзі трымаюцца за свае месцы. Бо ведаюць: варона з куста — пяць на куст. «Попыту на некваліфікаваных працаўнікоў бадай што няма, — сцвярджае Алена Змушка. — Наймальнікам патрэбныя людзі, якія маюць спецыяльнасць. Хай без досведу, але хоць бы з разуменнем, што і як трэба рабіць». Жывая ілюстрацыя да прыказкі, што без навукі як бязрукі. Не маеш прафесійнай адукацыі — добрай вакансіі табе не відаць.

НЕ ПЕРААЦЭНЬВАЦЬ СЯБЕ

Сярод запатрабаваных у Калінкавіцкім раёне спецыялістаў — заатэхнікі, ветэрынарныя ўрачы і фельчары, трактарысты, кухары, тынкоўшчыкі, зваршчыкі, электраманцёры, станочнікі дрэваапрацоўчых станкоў і вальшчыкі лесу. Не хапае таксама педагогаў-псіхолагаў, сацыяльных педагогаў, музработнікаў. І ўжо каторы год трымаецца попыт на прадаўцоў. Але нават пры наяўнасці патрэбнай кваліфікацыі не ўсе беспрацоўныя спяшаюцца займаць прапанаваныя вакансіі. Прычыны гэтага розныя: ад нізкай зарплаты да неспрыяльных умоў працы. «Прыходзіць да нас жанчына-прадавец з вопытам работы, — расказвае Алена Змушка, — але яна шматдзетная маці. А крамы, самі ведаеце, і да дзясятай, і да адзінаццатай вечара цяпер працуюць. І калі ёй дзяцей глядзець з такім графікам?»

Таксама многія саіскальнікі пераацэньваюць свой «кошт» на рынку працы. «Некаторыя не могуць пісьменна запоўніць дакументы, а хочуць мець «на старце» тысячу рублёў у месяц. Па чалавеку адразу відаць, што не «цягне» ён на такую зарплату. У той жа час талковы работнік можа паступова прэтэндаваць на яе павышэнне. Але сваю вартасць трэба спачатку даказаць працай».

І ШВЕЦ, І ЖНЕЦ...

Наяўнасць кваліфікацыі істотна павышае шанцы, але стопрацэнтнага гарантый працаўладкавання не дае. Жыхар Калінкавічаў Арцём заканчвае адну з прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. Ва ўпраўленне ён прыйшоў, каб даведацца пра вакансіі. «Па спецыяльнасці я кранаўшчык, — расказвае ён. — Вучуся на бюджэтным аддзяленні і ў перспектыве павінен адзін год адпрацаваць па размеркаванні. Але ў маёй установе развялі рукамі: размеркаваць нікуды не могуць, бо няма вакансій. Таму працоўнае месца даводзіцца шукаць самастойна. Нават неабавязкова па спецыяльнасці. І нас такіх цэлая група — 28 чалавек. Магчыма, у цэнтры занятасці падкажуць нейкія варыянты». Сітуацыя невясёлая, але зразумелая: будаўнічая галіна апошнім часам прыкметна «прасела». І працоўных месцаў не заўсёды хапае нават работнікам са стажам.

Будучы прадпрымальнік Ірына ЛУК'ЯН.

Дарэчы, прафесійна-тэхнічную або сярэднюю спецыяльную адукацыю маюць амаль 45% калінкавіцкіх беспрацоўных. Яшчэ 9% — уладальнікі ўніверсітэцкіх дыпломаў. Але кан'юнктура рынку працы не заўсёды складваецца на карысць таго ці іншага спецыяліста. І тым, хто не можа ўладкавацца па спецыяльнасці, аддзел занятасці прапаноўвае прайсці перападрыхтоўку. Бо чым болей прафесій чалавек асвоіў, тым большыя ў яго шанцы знайсці сваё «месца пад сонцам».

Гэта пацвярджаюць і патрабаванні работадаўцаў. Тыповы прыклад: адно з калінкавіцкіх прадпрыемстваў шукае вартаўніка з правамі кіроўцы. Каб ён мог пры неабходнасці замяніць іншага работніка. Сёння няма эканамічнай рацыі адначасова трымаць у штаце і электрыка, і сантэхніка. Прасцей узяць аднаго чалавека, які будзе ладзіць праводку, а пры патрэбе і кран памяняе. Словам, і швец, і жнец. Такім чынам, аптымізацыя кадраў — гэта не абавязкова звальненні.

НЕ ПРЫГАВОР, А ШТУРШОК

Дый звальненне часам не «прыгавор», а штуршок да новага этапу ў жыцці. Ірына Лук'ян 20 гадоў адпрацавала ў банку. Але патрабаванні да кваліфікацыі работнікаў сталі больш строгімі. І каб працаваць у крэдытным аддзеле, цяпер неабходна мець у дыпломе спецыяльнасць «Банкаўская справа». У выніку паўстала пытанне выбару: мяняць работу або пачынаць працаваць на сябе. Ірына выбрала другое. «Мяне зацікавіла сфера турызму, — расказвае жанчына. — З'явілася думка адкрыць уласнае турагенцтва. Але пачынаць усё адно было боязна. Ды ў цэнтры занятасці мяне маральна і матэрыяльна падтрымалі».

11 бюджэтаў пражыткавага мінімуму, або каля 2000 рублёў, — субсідыю на адкрыццё ўласнага бізнесу Ірына атрымала як беспрацоўная. Навучылі яе і асновам прадпрымальніцкай дзейнасці, накіраваўшы на адпаведныя бясплатныя курсы. І ўжо ў красавіку ў Калінкавічах павінна з'явіцца новае турагенцтва. Вядома, Ірыне давялося ўкласці ў гэтую справу і ўласныя сродкі. «Працуючы ў банку, я ведала, як важна рабіць зберажэнні, хоць бы невялікія. І гэтыя грошы мне дапамаглі ў складаны момант. Але без дзяржаўнай дапамогі і фінансавай падтрымкі я наўрад ці рызыкнула б пачаць уласную справу. Затое цяпер упэўненая: пры жаданні ўсё магчыма!»

Валянцін БОЙКА.
boika@zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении **3 апреля 2017 года** повторных торгов по продаже конфискованного имущества

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)	«Изолированное помещение (квартира №16) с инвентарным номером 500/D-12418, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Леонида Беды, 10-16, площадь 73,4 кв. м, год постройки 2003» (назначение: квартира, число комнат: 2)
Начальная цена	149 850,00 бел. руб.
Сумма задатка	15 000,00 бел. руб.
Организатор аукциона	Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 №63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.
К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Аукцион проводится 03 апреля 2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 15.03.2017 по 29.03.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».

УНН 200299909

Извещение о реализации недвижимого имущества

ОАО «БАРАНОВИЧИДРЕВ»

Торги состоятся 27 марта 2017 года в 14.00 по адресу:
Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А.М. проводит торги в форме аукциона по реализации объектов недвижимости.
Конт. тел.: 8-029-6332490 vel.; (029) 8248026 МТС; факс (0163) 455124;
E-mail: mischuk_am@mail.ru

ПРЕДМЕТЫ АУКЦИОНА
Комплекс зданий и сооружений, объединенных в ЛОТ №5:

- объект недвижимости, в г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/10, капитальное строение, с инв. №110/С-112752 площадью 540,2 кв. м, здание специализированное для ремонта и техобслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование-здание гаража и склада с пристроенными административно-бытовыми помещениями, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003003526, площадью 0,7719 га, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/11.
СТОИМОСТЬ: 33 300 рублей, без НДС.

- объект недвижимости, в г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/11, капитальное строение, с инв. №110/С-112747 площадью 692,5 кв. м, здание многофункциональное, наименование АБК №3, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003003526, площадью 0,7719 га, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/11.
СТОИМОСТЬ: 63 360 рублей, без НДС.

- объект недвижимости, в г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/12, капитальное строение, с инв. №110/С-112744 площадью 249,6 кв. м, здание специализированное для ремонта и техобслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание гаража, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003003526, площадью 0,7719 га, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/11.
СТОИМОСТЬ: 14 580 рублей, без НДС.

- объект недвижимости, в г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/9, капитальное строение, с инв. №110/С-112456 площадью 1026,6 кв. м, здание неустановленного назначения, наименование: центральный склад – арочный, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003003526, площадью 0,7719 га, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/11.
СТОИМОСТЬ: 55 260 рублей, без НДС.

ОБЩАЯ СТОИМОСТЬ ЛОТА №5–166 500 рублей, без НДС.

Победитель торгов обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в рублях РБ в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения аукционных торгов.
Составной частью к лоту №5 является площадь асфальтного покрытия, оплачиваемая победителем торгов по отдельному договору.
Сумма задатка: 10% от начальной цены лота №5 в рублях РБ.
Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с 012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Барановичи.
Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.
Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.
Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по ЛОТУ №5 в срок до 14.00 22.03.2017 года организатору торгов, председателю ликвидационной комиссии Мищуку А. М. по адресу: 225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. ВОСТОЧНЫЙ ПОСЕЛОК, 3, ОАО «Барановичидрев». Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Более подробно с условиями аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 15.03.2016 года.

ЦЭНІМ ВАДУ, КАЛІ ВЫСЫХАЕ КАЛОДЗЕЖ...

У Беларусі сапраўды шмат вады: водазабеспячэнне аднаго беларуса ў кубаметрах у разы перавышае аналагічны паказчык у Польшчы і Украіне. Гэты рэсурс штодня выкарыстоўвае кожны, аднак успамінаюць пра яго значна радзей, чым пра нафту або газ. Таму сумесна з дзяржаўнай установай «Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя» і ўнітарным прадпрыемствам «Мінскводаканал» мы падрыхтавалі артыкул, у якім адказалі на пытанні зацікаўленых пра ваду. Гэтую інфармацыю павінен ведаць кожны беларус.

Пітная вада ў Беларусі: добрая ці дрэнная?

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пітным водазабеспячэнні» якасць вады, якую атрымліваюць спажыўцы, павінна адпавядаць патрабаванням нарматыўных прававых актаў. Таму трэба карыстацца паняццямі «адпавядае патрабаванням нарматыву» або «не адпавядае». «Дрэнная» ці «добрая» — гэта суб'ектыўная ацэнка. А па выніках лабараторных даследаванняў пітная вада як у Мінску, так і па краіне адпавядае патрабаванням СанПіН — дакумента, у якім адлюстраваны гігіенічныя патрабаванні да яе якасці.

Чаму ў розных рэгіёнах вада адрозніваецца?

Нормы СанПіН па ўсёй краіне аднолькавыя (яны аднолькавыя, дарэчы, і для большасці краін СНД, а па асобных паказчыках у Беларусі нормы нават больш жорсткія). Адрозніваюцца ж фактычныя паказчыкі — у залежнасці ад крыніцы водазабеспячэння. Каб даведацца, якая вада цячэ ў вашай кватэры ці доме, можна здаць яе на аналіз у спецыяльную лабараторыю: яны існуюць па ўсёй краіне. Жыхарам сталіцы пашанцавала больш: сёння на сайце «Мінскводаканала» ўстаноўлены спецыяльны модуль, з дапамогай якога можна на працягу некалькіх хвілін даведацца пра стан вады ў Мінску. Дастаткова ўвесці ў поле на карце назву вуліцы і нумар дома, і карыстальнік атрымлівае табліцу з дакладнымі значэннямі канцэнтрацыі розных рэчываў.

Штогод беларускімі лабараторыямі адбіраецца звыш 105 тысяч проб, выконваюцца больш за 330 тысяч аналізаў прыроднай і пітной вады. Акрамя рэалізацыі працоўных праграм, адбіраюцца пробы вады пасля лакалізацыі аварый, паводле скаргаў насельніцтва, пры адпрацоўцы тэхналогіі водападрыхтоўкі.

Што ўплывае на якасць вады ў кватэры ці доме?

Якасць вады ў кватэры спажыўца залежыць і ад стану унутрыдамавых камунікацый. За належную эксплуатацыю ўнутрыдамавой сістэмы водазабеспячэння адказвае арганізацыя, якая абслугоўвае дом, — напрыклад, ЖЭС. Несумненна, варта і самому звяртаць увагу на стан труб ва ўласнай кватэры або доме.

Чаму ў сталіцы вада не аднолькавая?

Водазабеспячэнне Мінска ажыццяўляецца з двух відаў крыніц. Ёсць падземныя — так званыя артэзіянскія свідравіны, а ёсць паверхневыя — рэзервовае вадасховішча Крылова. На сённяшні дзень 30% горада (Фрунзенскі раён і часткова Маскоўскі) атрымліваюць ваду з паверхневых крыніц водазабеспячэння. Жыхары менавіта гэтых раёнаў часцей за ўсё наракаюць на нізкую якасць пітной вады. Большая частка горада — Савецкі, Першамайскі, Цэнтральны, Ленінскі, Партызанскі, Заводскі, вялікая частка Кастрычніцкага і частка Маскоўскага раёнаў — спажывае ваду з падземных крыніц.

Прыродная вада з Вілейскага вадасховішча па каналe Вілейска-Мінскай воднай сістэмы паступае ў рэзервовае вадасховішча Крылова, адкуль падаецца на ачышчальную водаправодную станцыю для ачысткі перад падачай у сетку. Тут ужываюцца розныя тэхналогіі водападрыхтоўкі, накіраваныя на зніжэнне канцэнтрацыі шкодных рэчываў. Для паляпшэння каляровасці, паху і смаку выкарыстоўваюцца азанаванне і вугляванне вады. А вось вада з артэзіянскіх крыніц пераважна падаецца спажыўцам без дадатковай ачысткі і апрацоўкі хлорам.

Чаму раёны сталіцы атрымліваюць ваду з розных крыніц?

Гэта звязана з гістарычным пралікам. У далёкія 70-я гады перспектыва развіцця Мінска разглядалася крыху па-іншаму. Планавалася, што ў тых раёнах, у якія вада сёння паступае з паверхневай крыніцы, будзе прамысловая зона. А для многіх прамысловых прадпрыемстваў не патрэбна такая чыстая вада, як для піцця. Гэта практыкуецца ў многіх краінах, дзе няма такіх вялікіх запасаў вады, як у Беларусі. Гэта значыць на прадпрыемства — напрыклад, у сталовую — паступае вада высокай якасці, а ў вытворчым цэху выкарыстоўваюць «тэхнічную» ваду. Аднак сёння ў Мінску можна піць ваду ў любым раёне, проста ў некаторых яна мае свае асаблівасці.

Акрамя таго, вада з паверхневай крыніцы выкарыстоўваецца для дадатковага водазабеспячэння сталіцы з-за росту насельніцтва.

Ці бяспечна піць ваду з калодзежа?

Так, але трэба пастаянна адсочваць стан вады ў такой крыніцы. Калодзеж патрабуе своечасовай ачысткі і рамонту. Акрамя таго, важную ролю адыгрывае месца яго размяшчэння. Калодзежы з'яўляюцца найменш абароненымі месцамі водазабеспячэння, і вада ў іх моцна залежыць ад уплыву надвор'я. Часцей за ўсё яны размяшчаюцца ў прыватным сектары, дзе часта няма каналізацыі, таму найважнейшае правіла — будаваць калодзеж як мага далей ад памыйных ям. Акрамя таго, існуюць грамадскія і прыватныя калодзежы. Грамадскія калодзежы знаходзяцца пад наглядам па ўсёй краіне. Калі ж гэта асабісты калодзеж, то ўладальнік папросту можа не пусціць правяраючых, таму яго стан вызначыць складана. Каб спакойна карыстацца вадой з уласнай крыніцы, не адмаўляйцеся ад дапамогі спецыялізаваных органаў: гэта можа захаваць вам здароўе. Дарэчы, патрабаванні да вады з калодзежа ніяк не адрозніваюцца ад патрабаванняў да водаправоднай вады.

Чаму ваду ачышчаюць хлорам?

У адпаведнасці з нарматывамі пітнога водазабеспячэння вада з паверхневых крыніц падлягае абавязковаму абеззараджванню. Апрацоўка вады хлорам забяспечвае доўгі бактэрыцыдны эфект і дазваляе захаваць эпідэмічную бяспечнасць вады пры яе транспартаванні да спажыўца. Колькасць хлору ў пітной вадзе рэгламентуецца як міжнароднымі, так і нацыянальнымі нарматывамі. Яны разлічаны такім чынам, каб забяспечвалася поўная дэзынфекцыя вады, але без ўплыву на здароўе людзей.

Па меры руху вады ад станцыі водападрыхтоўкі да спажыўца канцэнтрацыя хлору паступова зніжаецца, таму нават у розных раёнах горада пах можа адчувацца па-рознаму. Таксама на канцэнтрацыю астаткавага хлору ўплывае тэмпература вады: чым яна ніжэйшая, тым даўжэй у ёй захоўваецца хлор, таму яго пах летам адчуваецца менш, чым зімой.

Нам прапаноўваюць розныя фільтры. Гэта сапраўды дапаможа ачысціць ваду?

«Мінскводаканал» падкрэслівае, што ў выпадку даачышчэння вады, у тым ліку бытавымі фільтрамі, магчыма пагаршэнне паказчыкаў фізіялагічнай паўнацэннасці. Але што гэта такое?

Акрамя гігіенічных нарматываў СанПіН, для здароўя чалавека вялікае значэнне маюць паказчыкі фізіялагічнай паўнацэннасці вады. Гэта паказчыкі агульнай мінералізацыі, колькасці макра- і мікраэлементаў, якія забяспечваюць прафілактыку розных захворванняў. Якасць вады, якая падаецца ў размеркавальную сетку па Беларусі, адпавядае і патрабаванням да фізіялагічнай паўнацэннасці пітной вады.

Часцей за ўсё сустракаецца незадаволенасць спажыўцоў, выкліканая пахам хлору ў водаправоднай вадзе, але з гэтым лёгка спраўляюцца простыя вугальныя фільтры. Таксама, паколькі хлор з'яўляецца лятучым рэчывам, для выдалення паху ваду перад ужываннем можна адстойваць на працягу некалькіх гадзін.

На думку спецыялістаў, галоўную праблему абезжалезвання вады бытавыя фільтры не вырашаюць. Трэба глядзець, што заяўляе вытворца: можа прыбраць яго фільтр злучэнні жалеза або не. Для гэтага патрэбныя спецыяльныя фільтры.

Чым адрозніваецца пітная вада ў бутэльках і вада з-пад крана?

Тут ёсць нюанс. Калі вы купляеце невялікую бутэльку, каб проста папіць, то яна наўрад ці доўга прастаіць ў кватэры. Аднак калі вы купляеце ваду, каб на ёй гатаваць, то гэта можа быць бутля ў 20 літраў, які надоўга затрымаецца на вашай кухні. Па сутнасці, там будзе тая ж вада з артэзіянскай свідравіны, якая бяжыць па нашых водаправодах. Аднак калі вада з бутэлькі стаіць у пакоі некаторы час пры тэмпературы 20—22 С°, то яна становіцца спрыяльным асяроддзем для размнажэння мікраарганізмаў, якія трапілі ў яе ў працэсе вытворчасці. У свідравіне вада стэрыльная, аднак у працэсе перагонкі праз трубы яна на выхадзе атрымлівае нармальны мікробны склад, які адпавядае санітарным патрабаванням.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

ВЯСНОВЫЯ КЛОПАТЫ

За падпалы — штраф

На жаль, прыкметай вясны па-ранейшаму застаюцца палы сухой расліннасці. Некаторыя з іх па маштабах нагадваюць лакальныя пажары – адзначылі ў Брэсцкім раённым аддзеле па НС.

Вось і ў гэтыя выхадныя па віне чалавека пачалося ўзгаранне сухой травы на беразе ракі Мухавец ля вёскі Шчэбрын Брэсцкага раёна. Потым вецер падхапіў агонь, полымя пачало распаўсюджвацца, мясцовыя жыхары выклікалі ратавальнікаў. Супрацоўнікі МНС ачаг ліквідавалі і канстатавалі, што выгарала ўся расліннасць на плошчы каля трох гектараў. Агонь распаўсюджваўся імгненна, наўрад ці ўсе птушкі, якіх тут звычайна многа, змаглі ўратавацца. Зараз праводзіцца праверка па факце здарэння. Калі ўдасца даказаць віну грамадзяніна, ён панясе адказнасць у выглядзе штрафу ад 10 да 40 базавых велічынь.

Падобнае здарылася з непрацуючым жыхаром вёскі Юнішча Столінскага раёна. За выпальваннем сухой травы на схіле супрацьпаводкавай дамбы ля вёскі Глінка яго засталі супрацоўнікі Столінскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету. Як паведаміў яе начальнік Генадзь СЫСА, складзены пратакол аб адміністратыўным правапарушэнні.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

Пайду ў засаду, залягу ў скрадок...

З другой суботы сакавіка ў Беларусі адкрываецца веснавы сезон паляванне на гусей і качараў.

У спісе дазволеных да здабычы птушак — гусь белалобая, гусь-гуменніца, гусь шэрая, казарка канадская, а таксама качары крыжанкі, чэрнеці чырвонагаловай, чэрнеці чубатай, чырка-траскунка і чырка-свістунка.

Паляваць на іх можна з засады і толькі са скрадка. А з першай суботы красавіка здабываць можна будзе і самцоў слонкі — ружэйным спосабам з засады (на цязе).

— Для здабычы гэтых птушак дазволена выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю, зараджаную выключна шротавымі патронамі, для вышуку і падачы здабытай дзічыны — пэўныя пароды паляўнічых сабак, — нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

БЕЗ ПАПЕРЫ НЯМА ВЕРЫ?

Барацьба з бюракратызмам «буксуе» на бытавым узроўні

Аб дэбюракратызацыі гавораць даўно і многа. І сякія-такія зрухі ў гэтай справе нават ёсць. Але ў паўсядзённым жыцці мы сутыкаемся з неабходнасцю запаўняць ці не стосы папер. Адны з гэтых дакументаў маральна ўстарэлі, а іншыя даўно можна перавесці ў электронны фармат. Тыповая бюракратычная сітуацыя — працаўладкаванне.

Для кадравіка савецкага гарту ідэальны работнік — той, у каго ў працоўнай кніжцы два запісы. Першы — што прыйшоў працаваць у пэўную арганізацыю. Другі — што пайшоў адтуль на пенсію. А з цяперашнімі маладымі адна бяда. Лётаюць, бы дурныя, з месца на месца, усё нейкія выгоды сабе вышукваюць. Але ж такі час: моладзь стала больш мабільнай, прагматычнай і не баіцца перамен у жыцці. І калі праца нечым не задавальняе — бывайце здаровы, жывіце багата! А я пашукаю сабе лепшае долі ў іншай канторы...

Гэтаксама і мне на золку журналісцкай кар'еры давялося папабегаць па розных рэдакцыях. А калі ўзяць да ўвагі непазбежныя ў юнацтве падзаробткі, то можаце сабе ўявіць «эпас», які я маю ў працоўнай кніжцы. Дзякаваць богу, цяперашнія наймальнікі ўсё часцей глядзяць на тое праз пальцы і больш зважаюць на твае навыкі, чым на паперы.

Але паперы свой рэванш усё адно бяруць. Калі прыходзіш афармляцца ў аддзел кадраў, надараецца дэжавю: усё гэта ты ўжо бачыў неаднойчы. А менавіта — стос абавязковых бланкаў. І ладную палову першага працоўнага дня ты крэмзаеш у графах, якія ў жыцці запаўняў ужо сто разоў. Пры гэтым не пакідае ўражанне, што многія з іх перапісаны са старых савецкіх узораў. Напрыклад, нацыянальнасць у наш час не пазначаюць нават у пашпарце. Але ў дакументах, якія запаўняюцца пры ўладкаванні на працу, такая графа дагэтуль сустракаецца. Хаця 50-ы артыкул Канстытуцыі сцвярджае: ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і паказання сваёй нацыянальнай прыналежнасці. Я магу хоць зулусам назвацца — і паспрабуйце дакажыце адваротнае. Нават на там-таме сыграю. Каму якая справа да майго этнічнага паходжання? Мінулі тыя часы, калі «няправільная» нацыянальнасць была нагодай узяць на заметку яе носьбіта. А графа ўсё вандруе з бланка ў бланк.

Яшчэ адна строгая графа патрабуе шчыра, як на духу, прызнацца, ці маю я сваякоў за мяжой. А таксама пералічыць, хто з іх дзе жыве і чым займаецца. Што гэта? Прывітанне ад пільных чэкістаў 30-х гадоў? Але ж трэба — значыць, трэба. Адказваю: мая бабуля ва ўкраінскім Чарнігаве вяжа шкарпэткі і глядзіць тэлевізар. Але — хоць забіце! — не ведаю, чым займаецца ў Партугаліі бацькаў стрыечны брат. Мяркую, што смакуе віно і купаецца ў моры... Ці падтрымліваю я зносіны з асобамі, якія пастаянна пражываюць за мяжой? Ці бываў я сам за мяжой? Калі? З якімі мэтамі? Гэта таксама рэальныя пытанні з анкеты. Але ж задаваць іх сучаснаму чалавеку — гэта ўсё адно што прасіць прыгадаць, колькі разоў у жыцці ён купляў хлеб, вытворчасці якога завода, па якой цане і ў якой краме. Бо цяпер ці не ў кожнага знойдуцца сваякі, сябры, знаёмыя ў іншых краінах. А многія з беларусаў катаюцца ў замежжа па некалькі разоў на год. А перапіскі з замежнікамі ў Фэйсбуку — гэта таксама лічыцца «падтрыманнем зносін»? Тэарэтычна я магу паспрабаваць падаць усе гэтыя звесткі ў поўным аб'ёме. Калі мне дадуць тыдні два водпуску і яшчэ пару пачкаў паперы...

> Няўжо нельга стварыць агульнанацыянальную базу даных усіх работнікаў? Уладкоўваешся, звальняешся, пераводзішся — і кадравік заносіць туды свежыя звесткі.

Чытаў некалі ў мемуарах Васіля Быкава, што той наўмысна «пасяліў» памерлага сваяка ў Заходнюю Германію, каб ухіліцца ад вайсковых збораў і спакойна займацца творчасцю. Дапамагло: у ваенкамаце, прачытаўшы тую анкету, вырашылі не прызываць з запасу «ненадзейнага» афіцэра. «Жалезная заслона» даўно абрынулася, а анкеты паранейшаму нясуць подых халоднай вайны. Навошта, скажыце, кадравікам звесткі пра маіх замежных сваякоў? Якой дзяржаўнай таямніцай я валодаю, калі ўладкоўваюся, напрыклад, дворнікам? Планам размяшчэння новых звышсакрэтных кантэйнераў для смецця на тэрыторыі ЖЭУ?

Што ў нас далей у спісе? Звесткі аб папярэдніх месцах работы? Пагаджуся: рэч патрэбная. Але я не ідэальны супрацоўнік з пункту гледжання «олдскульнага» кадравіка. І пакуль перапішаш усе даныя з працоўнай кніжкі, рука дранцвее. І тут лагічна задацца пытаннем: чаму ў эпоху суцэльнай камп'ютарызацыі мы дагэтуль псуём паперу? Няўжо нельга стварыць агульнанацыянальную базу даных усіх работнікаў? Уладкоўваешся, звальняешся, пераводзішся — і кадравік заносіць туды свежыя звесткі. А на новым месцы яго калега бярэ іх з базы. Калі што, можна раздрукаваць. І работадаўцам было б прасцей: ужо не «згубіш» працоўную кніжку, калі з папярэдняга месца звольнілі па «непрыгожым» артыкуле.

Працаўладкаванне — гэта толькі адна з бюракратычных сітуацый. А калі сягнуць глыбей у офісныя працэсы, то высвятляецца, што ў нас дагэтуль «ганяюць» маральна ўстарэлыя факсы, шлюць кур'ераў, пачкамі закупляюць канверты з маркамі для міжведамаснай перапіскі. Хоць даўно існуе сістэма электроннага дакументаабароту, дзе кожная «віртуальная» папера мае лічбавы подпіс, што засведчвае яе сапраўднасць. І тысячы прадпрыемстваў і арганізацый да сістэмы даўно падключыліся. Але па-ранейшаму карыстаюцца старымі, звыклымі папяровымі дакументамі. І, адпаведна, устарэлымі сродкамі сувязі. Класічны выпадак, калі праблема не ў тэхніцы, а ў галовах. І дзе ж тая дэбюракратызацыя, пра якую мы так любім пагаварыць пры нагодзе? Забуксавала ў папяровых завалах?

Папер павінна быць як мага менш. Пра гэта гавораць усе: ад прадпрымальнікаў да міністраў. Але вялікую справу трэба пачынаць з малога — са штодзённага жыцця. Інакш барацьба з лішнімі папярамі будзе як лекцыя аб шкодзе тытуню, пасля якой усе ківаюць у знак згоды і... дружна закурваюць.

Валянцін БОЙКА.
boika@zviazda.by

ОТЧЕТ МЕСТНОГО БЛАГОТВОРИТЕЛЬНОГО ФОНДА УНП 790613221

«Возрождение историко-архитектурных памятников города Мстиславля» об использовании своего имущества за 2016 год

Местный благотворительный фонд «Возрождение историко-архитектурных памятников города Мстиславля» информирует о продолжении своей деятельности согласно Уставу по адресу: Могилевская область, г. Мстиславль, ул. Чкалова, д. 26.

Учредители фонда:
1. Галактионова Светлана Юрьевна
2. Кириенко Людмила Сергеевна
3. Кнороз Наталья Анатольевна
4. Малиновская Татьяна Николаевна
5. Пиванков Владимир Николаевич
6. Прокофьев Геннадий Михайлович
7. Поклад Татьяна Сергеевна
8. Пискижова Валентина Григорьевна
9. Федоненков Николай Викторович
10. Цырикова Наталья Михайловна

2. Информация о стоимости имущества фонда:
- имущество, переданное учредителями фонда, – 1800 рублей 00 копеек;
- доходы, полученные от добровольных взносов и пожертвований граждан и организаций, – 294 138 рублей 69 копеек;
- доходы от предпринимательской деятельности, осуществляемой в порядке, предусмотренном действующим законодательством, – нет.
3. Информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе: - расходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, – 291 266 рублей 57 копеек.
4. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц.

Директор Фонда **Н.В.Федоненков**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18

Предмет аукциона – (имущество реализуется одним лотом).
Месторасположение: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино

Цех деревообработки с административными помещениями, инв. №615/С-35497 (здание нежилое) – 1027,1 кв. м. Составные части и принадлежности: две вент. камеры, рампа, сети питьевого водопровода (а1) 184,7 м, бытовой канализации (а2) 255,7 м, ливневой канализации (а3) 287,4 м, очистные сооружения ливневой канализации (а4), двухкамерный септик (а5), поля фильтрации (а6) 235 м, покрытие (а7, а8, а9) 6446 кв. м

Склад (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ), инв. №615/С-35853 – 150,6 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка (1)

Контрольно-пропускной пункт (здание неустановлен. назначения), инв. №615/С-35856 – 7,6 кв.м. Составные части и принадлежности: ограждение (А1) 639,7 м

Трансформаторная подстанция (здание специализир. энергетики), инв. №615/С-245 – 68,3 кв. м

Водозаборная скважина (сооружение специализир. водохозяйственного назначения), инв. №615/С-35855. Составные части и принадлежности: насос Grundfos

Насосная станция (здание нежилое), инв. №615/С-35496 – 25,2 кв. м. Составные части и принадлежности: два резервуара 150 куб.м., сети пожарного водопровода 484,3 м

Иное имущество: сети электроснабжения (внутриплощадочные), комплект оборудования насосной: насосы – 2 шт., манометры, пост управления кнопочный, щит насосной, датчики РОС, светосигнализатор, котельная установка с комплектом оборудования, два силовых трансформатора, две сушильные камеры с комплектом оборудования (тележка ТД-1250 с рельсами, вентиляторы – 3 шт, эл.шкаф), два агрегата конденсатной сушки, система противопожарной автоматики, сумматор СЭМ-1, два счетчика эл/эн Евро Альфа ЕА10RL Р2С-4, комплект низковольтного оборудования трансформаторной подстанции

Сведения о земельном участке: пл. **2,5727 га** предоставлен продавцу на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно-бытовыми помещениями, зданий и сооружений. Ограничения (обременения) – находится в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,2000 га

Начальная цена с НДС – 780 772 руб. 14 коп.

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г.Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи:	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**18.04.17** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**17.04.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ

имущества принадлежащего ООО «Ремонт-Реал», находящегося по адресу: Гродненская область, Ошмянский район, д. Буденовка (производственная база)

№ лота	Наименование лота	Начальная цена продажи, руб. (без уплаты НДС)	Шаг аукциона,%	Задаток, руб. (10% от начальной цены)
1	Рама пильная РП (63)4	3 050	5	305
2	Станок брусовальный MEBOR BHS 2/55	34 260	5	3 426
3	Станок многопильный ДК-150	3 680	5	368
4	Станок ТПА-7	1 350	5	135
5	Автомобиль грузовой МАЗ 54323, 2000 г.в.	3 940	5	394
6	Автомобиль грузовой КАМАЗ 65117, 2008 г.в.	26 980	5	2 698
7	Автомобиль FORD TRANZIT, 1995 г.в.	640	5	64
8	Полуприцеп KOEGEL, 1992 г.в.	1 870	5	187
9	Прицеп KRONE,1999 г.в.	4 640	5	464

Аукцион состоится **19 апреля 2016 года** в 14.30 по адресу: г. Гродно, ул. Сов. Пограничников, 102, каб.104.
Организатор аукциона – управляющий ООО «Ремонт-Реал» Бахуревич Е. В., тел.(8-029) 3608384.
Для участия в аукционе необходимо:
1. **Оплатить задаток** на расчетный счет ООО «Ремонт-Реал» 3012127877015 в ОАО «БПС-СБЕРБАНК», г. Минск, код 369, УНП 590882361.
2. **По 17 апреля 2017 г. включительно до 16.00 подать заявление** на участие в аукционе и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: 230025, г. Гродно-25, а/я 13.
К заявлению прилагаются следующие документы:
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);
- индивидуальным предпринимателям – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицам – доверенность , выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации юридического лица;
- иностранным юридическим лицам, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государствам и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности , выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией;
- представителю иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность , документы о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданные обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией без нотариального засвидетельствования;
- представителю гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
В случае если аукцион признан не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.
Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать свое заявление на участие в нем. Не явка участника аукциона на аукцион признается отказом от участия в аукционе. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победителем аукциона будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем аукциона**, обязано:** подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 10 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.
Тел. организатора аукциона: 8029-360-8384.

ПЫТАЛЬНІК

ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ДАВЯДЗЕЦЦА МЯНЯЦЬ З-ЗА СТАРАСЦІ

Зрабіць гэта можна па цэнах завода-вытворцы і з растэрміноўкай

Піша вам ветэран працы, пенсіянер па ўзросце, інвалід другой групы, падпісчык вашай газеты з 1968 года. У мяне такі зварот. З сярэдзіны 1988 года карыстаюся газавай плітой Брэсцкага завода газавай апаратуры. Яна і па сённяшні дзень знаходзіцца ў прыдатным для эксплуатацыі стане. 23 лютага Іўеўскі РГЗ прапанаваў гэтую пліту замяніць (гэта значыць, у іх купіць) на новую. У прынцыпе я не супраць гэтай прапановы. Але пры гэтым узнікаюць наступныя пытанні. Чаму прыдатную для эксплуатацыі газавую пліту я павінен мяняць (купляць) на новую? Чаму я павінен аплачваць сто працэнтаў новай пліты? А дзе льготы для пенсіянера, інваліда другой групы, які жыве адзін?

Леанід Уладзіміравіч ТРАФІМЧЫК, *г. Іўе.*

Падрабязныя адказы на пытанні нашага чытача рэдакцыі аператыўна даў галоўны інжынер Іўеўскага раёна газазабеспячэння (РГЗ) вытворчага ўпраўлення «Смаргоньгаз» Васіль Грынеўскі:

— Тэрмін эксплуатацыі газавай пліты ўстаноўлены не вышэй за 20 гадоў. Па заканчэнні 10—14 гадоў эксплуатацыі (гэта залежыць ад канкрэтнай маркі і прапісана ў пашпарце на канкрэтную пліту) абанент абавязаны пісьмова звярнуцца да нас з заявай аб правядзенні дыягностыкі. Пасля яе заканчэння, калі няма пытанняў да тэхнічнага стану, мы можам прадоўжыць тэрмін эксплуатацыі пліты. Але, як ужо было сказана вышэй, не больш, чым 20 гадоў. Колькі газаваму абсталяванню ў кватэры вашага заяўніка, вы кажаце? Эксплуатуецца з 1988 года? Вось і лічыце. А гэта ж пытанні бяспекі.

Як расказаў далей Васіль Міхайлавіч, незадоўга да таго, як чытач напісаў у газету, на вуліцы, дзе ён жыве, праводзілі тэхнічнае абслугоўванне газавага абсталявання. Верагодна, работнікі прадпрыемства і звярнулі ўвагу на пліту Леаніда Уладзіміравіча і прапанавалі яе памяняць.

— У выпадку адмовы мы маем права спыніць газазабеспячэнне канкрэтнага абанента. Разам з тым, уваходзім у становішча чалавека, якому бывае цяжка ў адзін момант узяць і купіць новую пліту. Звычайна на гэта даём адтэрміноўку на месяц-два, а то і тры, — расказаў далей галоўны інжынер прадпрыемства.

А вось льгот на набыццё газавых пліт няма. Іўеўскі раён газазабеспячэння вытворчага ўпраўлення «Смаргоньгаз» сапраўды прапануе прадукцыю Брэсцкага завода газавай апаратуры пад гандлёвай маркай «Гефест». Але, па-першае, гэта адпускныя цэны вытворцы. Напрыклад, самую танную чатырохканфорачную пліту можна набыць за 250 рублёў, далей цэннік ідзе да 400—500 рублёў і больш. З іншага боку, паколькі заяўнік жыве адзін, можна выбраць і варыянт з дзвюма канфоркамі за 160 рублёў. Па-другое, прадпрыемства прапануе гэтую прадукцыю завода з растэрміноўкай на шэсць месяцаў. Па словах Васіля Міхайлавіча, у Лідзе, напрыклад, ёсць крама, дзе на пліты таксама даецца растэрміноўка. Але транспартныя выдаткі і страта часу могуць звесці на нуль магчымую выгаду. А ў Іўі ўся лінейка прадукцыі з Брэста выстаўлена ў фае прадпрыемства, ёсць каталог. Напрыканцы галоўны інжынер прапанаваў заяўніку звярнуцца ў выпадку цяжкага матэрыяльнага становішча ў органы сацзабеспячэння па аднаразовую сацыяльную дапамогу. Магчыма, чытач трапіць у лік маючых патрэбу, і гэта стане падтрымкай у набыцці новай пліты.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Парадаваць саміх сябе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Жанчыны запрашаюць зайсці ў пад'езд, які ззяе чысцінёй. Лесвічныя пралёты пафарбаваныя ў яркія колеры. Аднастайнасць перабіваюць намаляваныя пад трафарэт кветкі — атрымалася весялей і ярчэй. Тут жа на сцяне пад'езда прымацаваная цэлая галерэя грамат і дыпломаў, якія руплівая грамада атрымала за свае імкненне і ўменне падтрымліваць парадак. Старанныя гаспадынькі ўпрыгожылі памяшканне агульнага карыстання кампазіцыямі са штучных кветак.

Але ж асаблівая славутасць гэтага дома — двор. І Надзея Сяргееўна, і яе суседка мяне адразу паўшчувалі, што не ў тую пару прыехала: «Ну, хаця б пасля Вялікадня, калі траўка пазелянее, вылезуць першыя кветкі, а малыя архітэктурныя формы пасля зімовага захавання вернем на месцы. Напрыклад, домік Бабы Ягі стаіць, а сама «гераіня» і іншыя атрыбуты зіму перажываюць на гарышчы». Але і без «архітэктуры» на кожным квадратным сантыметры гэтай тэрыторыі адчуваецца руплівая рука яе гаспадароў.

> “Ёсць прыклады, калі ініцыятыўныя жыльцы не афармлялі арганізацыйна свой орган дамавога самакіравання, але сумелі так паставіць справу, што поспехаў дабіліся несумненных.

Двор каля дома №2 даволі вялікі. І жыльцы, здаецца, задзейнічалі пад прыгажосць усю плошчу. Пабудавалі з дошак домікі і ветракі, з камянёў ды іншых падручных матэрыялаў зрабілі казачныя кампазіцыі. Так, стары веласіпед пафарбавалі ў залацісты колер і прымацавалі да сцяны, прывязаўшы да багажніка кош, з якім раней хадзілі ў краму. Атрымаўся такі рэтрасюжэт у стылі 60-х. Для белага пластмасавага каня змайстравалі вазок з дошак, пафарбавалі ў сіні колер, са старой мешкавіны зрабілі груз — не пусты ж воз вазіць каню. І адразу кампазіцыя з ветраком ажыла. А ўжо каля дома Бабы Ягі цэлая кампанія: і драўляны конь з бочкай вады, і каты вучоныя, і вожыкі каменныя, і мядзведзі, якія пілуюць бервяно.

Як прыйдзе вясна, людзей не трэба ўгаворваць выйсці на суботнік. Хто што можа, тое і робіць на агульную карысць. Мастак Сяргей Сталбоў заўсёды нешта малюе, хто ўмее працаваць з дрэвам — робіць новую фігурку.

Ганна Міхайлава і Зоя Нацковіч.

Жыльцоў дома, у якім 10 кватэр, ужо некалькі разоў адзначалі за перамогу ў спаборніцтве па добраўпарадкаванні на гарадскім і абласным узроўнях. А да грамат, як вядома, найчасцей даюцца і прэміі. Дык вось за прэмію 2011 года купілі касілку. Цяпер абкошваць тэрыторыю стала лягчэй. За іншыя прэміі набывалі фарбу і ўсё неабходнае для навядзення парадку.

«Ліўнёўка» і дзіцячая пляцоўка

Камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Вясёлкавы» ўтварыўся на вуліцы Калгаснай. У яго ўвайшлі дамы №№74, 76 і 78. Яго кіраўнік Ганна Міхайлава расказала, што раней тут была даволі балоцістая мясцовасць, і шмат гадоў жыльцы пакутавалі ад вады. Нават невялікія дажджы, не кажучы пра вясну-восень, залівалі падвалы, і лужыны доўга стаялі ля самых пад'ездаў. Вось з гэтага пачыналі — сабраліся грамадой і вырашылі правесці «ліўнёўку» ўздоўж дома. Пазней у яе вывелі адлівы з даху. «І адразу якасць жыцця памянялася, — успамінае Ганна Феліксаўна, — пад нагамі стала суха, прапала сырасць у падвале».

Каля дома па вуліцы Калгаснай.

Далей — болей. На месцы, дзе раней гаспадарылі машыны, абсталявалі дзіцячую пляцоўку. Паставілі некалькі арэляў, горку, зрабілі пясочніцу. І двор ажыў.

Потым вырашылі палепшыць тэрыторыю кардынальным чынам. Калі дамы так размешчаны, што ў двары сонца бывае толькі пасля абеду, тэрыторыю можна расквеціць жывымі краскамі, — разважылі жанчыны. Гэту работу ўзначаліла Ганна Міхайлава, якая знайшла аднадумцаў. Тэрыторыя вакол тратуараў невялікая, але і яе спрэс засадзілі кветкамі, дэкаратыўным кустоўем, газоннай травой. Цяпер, ранняй вясной, гэта ўявіць не так проста, ды Ганна Феліксаўна паказала летнія фотаздымкі — прыгажосць дый годзе. Сама старшыня камітэта «Вясёлкавы» любіць эксперыментаваць з каменем. Дэкаратыўныя кошыкі з каменя ажыўляюць і зімова-вясновыя пейзажы. А коцік, зроблены з двух камянёў, — гэта ўжо аўтарская работа. Матэрыял трывалы, не патрабуе зімовага захавання ў памяшканні, таму вясёлы і прывабны кот сустракае кожнага, хто заходзіць у пад'езд дома №76.

Цікаўлюся, ці часта даводзіцца збіраць з жыльцоў грошы на агульныя справы. Ганна Феліксаўна гаворыць, што збіраюць «па меры патрэбы на самае неабходнае». З тых грошай, што сабралі летась, крыху засталося на насенне кветак. Так што сёлета газоны таксама будуць квітнець. Яшчэ кіраўнік камітэта і яе аднадумца Зоя Нацковіч расказалі, як выхоўваюць маладое пакаленне. Часта ў двор забягаюць дзеці з суседніх дамоў. Жанчыны паспрабавалі прыцягнуць іх да грамадска-карыснай працы. І школьнікі... з задавальненнем сталі дапамагаць. А тыя хлопчыкі і дзяўчаткі, якія нешта зрабілі сваімі рукамі, ламаць і псаваць гэта ніколі не будуць — пераканаюая жанчыны.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

Аляксандр СЕЛІФОНТАЎ, старшыня Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў:

— Гарадскі Савет усяляк падтрымлівае ініцыятыўных гараджан, якія сваімі рукамі паляпшаюць тэрыторыі і тым самым спрыяюць павышэнню якасці жыцця. Мы стараемся іх заахвоціць маральна і матэрыяльна. Гаворка ідзе аб прэміях па выніках спаборніцтваў. Акрамя таго, дапамагаем справай. ЖЭС-7, на тэрыторыі якой знаходзіцца і КТГС «Вясёлкавы», і дом па вуліцы Чыгуначнай, пастаянна аказвае дапамогу ў справе добраўпарадкавання. Камунальнікі, напрыклад, выдзяляюць дэкаратыўныя расліны, вось і летась на вуліцу Калгасную завезлі кустоўе, жыльцы яго пасадзілі. Дапамагаюць транспартам і рабочай сілай.

І названы камітэт, і ўсе іншыя камітэты самакіравання пастаянна ў полі зроку дэпутатаў гарадскога Савета. З пачатку красавіка прайшлі сустрэчы дэпутацкіх груп па тэрытарыяльнай прыкмеце ў ЖЭСах. Разам з камунальнікамі, прадстаўнікамі іншых службаў яны намецілі планы сустрэч з выбаршчыкамі. Ставіцца задача прыцягнуць як мага больш людзей да самастойнага прыняцця рашэнняў па добраўпарадкаванні сваіх тэрыторый.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
